НОВЫЯ ТАРЫФЫ НА КАМУНАЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ 5

БУДЗЕМ РАЗАМ! КАЛЯНДАР «ЗВЯЗДЫ» 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 СТУДЗЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 1 (28868)

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«Грамадзяне краін Еўразійскага эканамічнага саюза з 1 студзеня могуць бяспошлінна ўвозіць у ЕАЭС тавары для асабістага карыстання на суму, не большую за 500 еўра, вага якіх не перавышае 25 кілаграмаў. Да гэтага норма бяспошліннага ўвозу складала 1500 еўра і 50 кілаграмаў. У адпаведнасці з Мытным кодэксам ЕАЭС, краіны — удзельніцы саюза маюць права толькі рабіць больш жорсткімі нормы бяспошліннага ўвозу на нацыянальным узроўні. Абмежаванні па бяспошлінным увозе тавараў да 500 еўра не закрануць звычайных турыстаў: беларусы з ліку звычайных турыстаў пры бязмытным увозе не дасягаюць «паталка» ўстаноўленых лімітаў. Тут ніякіх пытанняў не было і не будзе».

КАРАТКА

• У рэйтынгу навагодніх ёлак краін СНД, які склала аналітычнае агенцтва «ТурСтат», галоўная ёлка Беларусі на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску ў гэтыя навагоднія святы ўвайшла ў топ-5 па вышыні.

• Фінансаваць некаторыя дзіцячыя садкі ў Беларусі будуць па новай схеме: сродкі з бюджэту выдзяляюцца ў залежнасці ад колькасці навучэнцаў.

• З 3 студзеня мінчане, якія знаходзяцца ў пошуку працы, змогуць азнаёміцца з наяўнымі вакансіямі толькі на партале Дзяржаўнай службы занятасці.

ISSN 1990 - 763X

НЯХАЙ НАША РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ ЗАЎСЁДЫ КВІТНЕЕ, ЖЫВЕ Ў МІРЫ І ЗГОДЗЕ

Фота БелТА.

Навагодні зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа

Дарагія сябры!

Надыходзіць самы дзівосны час у годзе, калі мінулае, сучаснае і будучае зліваюцца ў адно імгненне. І застаюцца ўсяго толькі секунды, каб ацаніць тое, што зроблена, падумаць аб тым, што чакае.

Гэты час сагравае і радуе сэрцы, аб'ядноўвае нас у самых лепшых пачуццях і чаканнях.

Традыцыйна сем'ямі, разам з роднымі, блізкімі, сябрамі вы сабраліся за святочным сталом.

Вядома ж, самыя шчаслівыя сярод нас — нашы дзеці. У школьнікаў доўгачаканыя канікулы.

І мая просьба да вас, хлопчыкі і дзяўчынкі: не забывайце, што ў вас ёсць бацькі, бабулі, дзядулі. Запрасіце іх на культурныя, спартыўныя мерапрыемствы. І проста правядзіце час разам. Гэтым вы падорыце ім нямала шчаслівых хвілін.

Разам з намі ў гэты святочны час наша будучыня — моладзь. Тое, якой мы ўбачым Беларусь заўтра, залежыць ад кожнага з вас. Гэта вы павінны захаваць і прымножыць створанае.

Сёння краіне асабліва патрэбны вашы інтэлект і энергія.

Памятайце: ніхто, ніколі і нідзе не будзе любіць і берагчы вас так, як дома.

Але асаблівую цеплыню сваіх слоў я накіроўваю вам, працаўнікам палёў і заводаў, нашай інтэлігенцыі, абаронцам Айчыны, старэйшаму пакаленню і старым. Усім, хто стварыў на жыватворнай беларускай зямлі першую суверэнную і незалежную дзяржаву, прадаўжае ствараць яе сучаснасць. Мы павінны ўмацаваць сваю дзяржаўнасць на прынцыпах сумленнасці і справядлівасці і менавіта такой захаваць краіну для дзяцей і ўнукаў.

Адыходзячы год дапамог нам асабліва адчуць сувязь з роднай зямлёй.

Ён стаў першым у трылогіі «Малой радзімы». Нагадаў, дзе тыя крыніцы, што даюць нам сілу і энергію.

Вярнуў да вытокаў. Туды, дзе па-асабліваму б'ецца сэрца, дзе ўспамінаецца самае запаветнае.

Мы аб'ядналіся ў імкненні зрабіць кожны куток Беларусі не проста прыгожым, а ўзорным.

І ў надыходзячым годзе нам трэба будзе зрабіць усё, каб краіна патанала ў зеляніне і кветках, натхняла на творчасць і стварэнне, каб нам заўсёды хацелася вярнуцца дадому.

Я не магу абысці ўвагай тых, хто цяпер на пасту: ахоўнікаў нашых жыццяў, людзей, якія забяспечваюць ваенную і эканамічную бяспеку Беларусі. Вялікі вам дзякуй за службу і адданасць справе!

Адыходзіць 2018 год...

Для кожнага з нас ён склаўся па-рознаму. Мы страчвалі родных і блізкіх, знаходзілі новых сяброў, нараджалі і гадавалі дзяцей. Усё, як звычайна ў жыцці. Але галоўнае — мы захавалі мірнае неба для беларусаў, і ў вачах нашых дзяцей няма страху і бязвыхаднасці ад вайны.

Давайце ўсе разам берагчы гэтую найвялікшую каштоўнасць.

У адыходзячыя імгненні старога года мы ўглядаемся ў абрысы новага, 2019 года.

Гэта год 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гэта год 25-годдзя Асноўнага Закона Беларусі.

Гэта год II Еўрапейскіх гульняў.

Гэта будзе год цяжкай працы, перамог і паражэнняў. Разам мы здольныя рабіць немагчымае. Мы абавязкова пераадолеем перашкоды і забяспечым будучыню нашай Радзімы.

Дарагія беларусы, госці нашай краіны!

Шчасця і дабра вам, вашым блізкім, вашым дзецям!

Няхай наша родная Беларусь, прыгожая сваімі прыроднымі багаццямі, велічная сваёй высокадухоўнай і культурнай спадчынай, моцная сваім мудрым, добрым, працавітым народам, заўсёды квітнее, жыве ў міры і згодзе.

З Новым годам, дарагія сябры!

Блізкая ўлада

АД ЭКСПАРТУ ДА СПОРТУ

У канцы года старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў правёў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў СМІ

Дыяпазон пытанняў быў даволі шырокі. Журналістаў цікавіла, як вырашаецца праграма па інвестыцыях, як расце і развіваецца горад атамшчыкаў, што цікавага адбылося ў рэгіёне ў Год малой радзімы, ці пашырацца межы бязвізу, колькі гродзенцаў паедзе на II Еўрапейскія гульні...

Фота БелТА.

Малочны рэкорд і аптымізацыя галіны

Сустрэча з журналістамі стала свайго роду падвядзеннем вынікаў 2018 года. І яны нядрэнныя. Як адзначыў кіраўнік рэгіёна, выкананы ўсе асноўныя прагнозныя паказчыкі. Валавы рэгіянальны прадукт вырас на 4 %. І хоць неспрыльныя ўмовы сельскагаспадарчага года даставілі аграрыям нямала клопатаў, але своечасовыя меры дазволілі захаваць станоўчую дынаміку ў жывёлагадоўлі. Рэгіён выйшаў «з плюсам» па малаку. Гэтым могуць пахваліцца толькі Гродзенская і Брэсцкая вобласці. Уладзімір Краўцоў з гонарам назваў гаспадаркі, дзе вытворчасць малака ад адной каровы ў год складае 10 тон. Такіх высокіх паказчыкаў дасягнулі ў СВК «Свіслач» і СВК імя Дзеншчыкова.

Журналісты з першых вуснаў даведаліся аб новай праграме развіцця малочнай галіны. Яна звязана з рэфармаваннем існуючых магутнасцяў. Так, замест шасці малочных заводаў у вобласці будзе створана тры буйныя кампаніі. Гэта «Малочны свет», Лідскі малочна-кансервавы камбінат і ААТ «Беллакт». Астатнія заводы далучаць да асноўных вытворцаў.

Экспартны вектар

Гродзеншына перабудоўвае свае экспартныя патокі. І хоць па-ранейшаму галоўнымі рынкамі збыту застаюцца краіны СНД (50 %), але значна ўзрос еўрапейскі напрамак. Яшчэ два гады таму акцэнты былі зусім іншыя. Зараз рэгіён амаль дасягнуў прагнозу ў гандлёвых стасунках з краінамі Еўропы. Туды накіроўваецца 24 % экспарту (плануецца выйсці на 30 %).

Другім па аб'ёме экспарту гандлёвым партнёрам з'яўляецца Польшча. У пяцёрку таксама ўваходзяць Украіна, Літва і Кітай. Усяго ў спісе гродзенцаў 115 краін-партнёраў. Так, за мінулы год удалося прадаць амаль на 20 % больш тавараў і зарабіць 2,3 млрд долараў. Увогуле рэгіён экспартуе палову таго, што вырабляе.

— Новы імпульс для супрацоўніцтва быў атрыманы на двух буйных міжнародных форумах — Беларусі і Расіі, а таксама Беларусі і Украіны, на якіх падпісана некалькі перспектыўных дагавораў, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. — Наладжваем сувязі з шэрагам кітайскіх правінцый.

Будуецца АЭС і горад

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што падрыхтоўчыя работы па пуску АЭС у Астраўцы выходзяць на фінішную прамую. Завоз ядзернага паліва плануецца ўжо ў першым квартале 2019 года, а ў канцы года павінен адбыцца запуск першага энергаблока. Гатоўнасць другога складае больш за 60 %.

Паралельна з будаўніцтвам АЭС расце і сам горад, які стаў галоўнай інвестыцыйнай пляцоўкай рэгіёна. Кожны год здаецца некалькі значных устаноў, у тым ліку сацыяльнага кірунку. Напрыклад, у 2018 годзе ўведзены дзіцячы сад, аздараўленчалазневы комплекс, перад Новым годам адкрылі сучасны стадыён, будуецца спартыўны комплекс з басейнам, міжраённая паліклініка, дом дзіцячай творчасці, школа.

— Гэта горад будучыні, які развіваецца і будуецца па новых, сучасных падыходах, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

Лагістычныя цэнтры растуць

Гэта новы і перспектыўны кірунак работы рэгіёна. Некалькі лагістычных цэнтраў ужо створана паблізу пунктаў пропуску, у студзені будзе здадзены яшчэ адзін такі аб'ект на КПП «Каменны Лог», крыху пазней запрацуюць склады на пагранпераходзе «Бераставіца». Яшчэ некалькі рэзідэнтаў СЭЗ заявілі аб стварэнні менавіта лагістычных цэнтраў.

— Аўстрыйскі інвестар гатовы ўзяць былую ваенную базу ў Свіслацкім раёне для свайго цэнтра, яшчэ і вытворчасць хоча там арганізаваць, — заўважыў губернатар.

Росту і пашырэнню лагістыкі спрыяе рэканструкцыя трасы М6, якая з'яўляецца зручным транспартна-транзітным калідорам прыгранічнага рэгіёна. Дарэчы, усе работы па будаўніцтве трасы павінны быць завершаны ў першай палове 2019 года.

Рэгіён цікавіць інвестараў

За 9 месяцаў мінулага года атрымана 70 млн долараў прамых замежных інвестыцый.

Удала працуе замежнае прадпрыемства ў Смаргоні «Кронаспан», якое займаецца вытворчасцю драўніны. Нядаўна тут уведзена новая магутнасць, будуецца фанерны цэх. Яшчэ адным знакавым інвестарам для вобласці стала расійская кампанія «Садружнасць», дзякуючы якой пабудаваны завод па перапрацоўцы алейных культур.

З інвестпраектаў, якія былі рэалізаваныя летась, губернатар адзначыў фабрыку шампіньёнаў у Шчучынскім раёне і ўводу ў строй буйнога цэха на заводзе «Гродна Азот». У найбліжэйшых планах — пуск беларуска-індыйскага прадпрыемства па выпуску лекаў у Скідзелі. Напачатку субстанцыі для парашкоў будуць дастаўляцца з Індыі, але ў далейшым плануецца іх выпуск на месцы.

Ці пашырыць межы бязвіз?

Губернатар упэўнены: бязвіз даў новы імпульс развіццю турызму. За два гады, што дзейнічае бязвізавая зона, Гродна і раён наведала каля 140 тысяч турыстаў, якія пакінулі тут амаль чвэрць мільёна долараў.

Аказалася, што ўлады зрабілі пэўныя захады для таго, каб рухацца далей у гэтым кірунку.

— Мы бачым, што гэта сфера развіваецца, і трэба ісці далей. Таму звярнуліся ў Міністэрства спорту і турызму з прапановай уключыць у бязвізавую зону Лідскі, Навагрудскі, Карэліцкі і Шчучынскі раёны. Тут нямала аб'ектаў, якія будуць цікавыя для турыстаў, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

У прыватнасці, раёны багатыя сваёй гістарычнай спадчынай. На некаторых аб'ектах зараз вядуцца аднаўленчыя работы. Таксама нямала мерапрыемстваў, якія праходзяць у рамках Года малой радзімы. Як вядома, яго рамкі пашырыліся і ахопяць 2019 і 2020 гады. Усё гэта павінна спрыяць інтарэсу беларусаў да сваёй малой радзімы, падкрэсліў Краўцоў.

— Важна, каб людзі не заставаліся ўбаку ад розных свят, акцый, цікавых падзей. Трэба як мага актыўней працаваць з энтузіястамі, краязнаўцамі, якія гатовы данесці гісторыю родных мясцін. Думаю, шырокаму колу будзе цікава даведацца і аб тых, хто за мяжой не забывае сваю радзіму і там праслаўляе свой край.

Спартыўны патэнцыял

Ці заявяць аб сабе гродзенскія спартсмены на II Еўрапейскіх гульнях? Прагнозы, вядома, справа няўдзячная, асабліва ў спорце, тым не менш гродзенская каманда гатовая для ўдзелу ў спаборніцтве.

— Будзем спадзявацца, яны выступяць дастойна, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. — У нас нядрэнны патэнцыял у такіх відах спорту як барацьба, лёгкая атлетыка, стральба, настольны тэніс, веласпорт і іншыя.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Год малой радзімы

МІНШЧЫНА ЎНІКАЛЬНАЯ

— У Год малой радзімы ў цэнтральным рэгіёне стартаваў праект «Міншчына дзівосная». Такіх няма ні ў адной вобласці краіны, — расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Таццяна ХМЕЛЬ.** — Мы разумелі, што ў праекце неабходна аб'яднаць і турыстычны патэнцыял вобласці, і самабытнасць традыцый яе жыхароў, і культуру рэгіёна. Паказваем унікальнасць месцаў і аб'ектаў, здавалася б, даўно вядомых, але пры больш пільным знаёмстве яны адкрываюць новыя цікавыя факты, займальныя гісторыі. Нам ёсць чым ганарыцца, і перш за ўсё — гэта нашы людзі, якія штодзённай працай услаўляюць свой край.

Год малой радзімы стаў лейтматывам і для моладзі Міншчыны пры правядзенні абласных мерапрыемстваў: патрыятычнай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», форуму сельскай моладзі, фестывалю здаровага ладу жыцця «Васільковы вянок», адукацыйнага праекта «Моладзь online», фестывалю камандаў вясёлых і знаходлівых на Кубак губернатара Мінскай вобласці, конкурсаў праектаў у сферы маладзёжнай палітыкі і «Малады лідар Міншчыны». Дабрабыт любога грамадства і яго росквіт у многім залежаць ад моладзі. Маладыя людзі займаюцца навукай, творчасцю, спортам, бізнесам, дабрачыннасцю. Гэтым яны робяць свой унёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці. Штогод на Міншчыне рэалізуюцца праекты, накіраваныя на павышэнне сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці моладзі, фарміраванне кадравага рэзерву, папулярызацыю прафесій. Адзін з такіх праектаў — адкрыты абласны форум сельскай моладзі, які збірае перспектыўных юнакоў і дзяўчат з усіх сфер дзейнасці.

У Год малой радзімы шмат робіцца для падтрымкі маладзёжнага прадпрымальніцтва. Безумоўна, росквіт рэгіёнаў, стварэнне рабочых месцаў, павышэнне дабрабыту насельніцтва немагчымыя без удзелу малога і сярэдняга бізнесу. І тут перш за ўсё ініцыятыва належыць моладзі. У сельскай мясцовасці дзяржава стварыла належныя ўмовы для развіцця рамесніцкай дзейнасці, агратурызму, рознічнага гандлю, грамадскага харчавання, аказання розных відаў паслуг. Кожны пяты жыхар цэнтральнага рэгіёна — малады чалавек ва ўзросце ад 14 да 31 года. Прыемна, што наша моладзь актыўная і імкнецца да рэалізацыі сацыяльна значных ініцыятыў. Мінская вобласць ганарыцца лаўрэатамі і стыпендыятамі фондаў па падтрымцы таленавітай і адоранай моладзі, пераможцамі рэгіянальных і абласнога этапаў агляду-конкурсу праектаў у сферы рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, пераможцамі конкурсу «Малады лідар Міншчыны».

Міншчына — край з багатай гістарычнай і культурнай спадчынай, разнастайнасцю нацыянальных традыцый, звычаяў, абрадаў, яркай палітрай фестываляў, свят, конкурсаў. Усе культурныя ініцыятывы і праекты, якія нараджаюцца сёння, шмат у чым абумоўлены культурна-гістарычнымі асаблівасцямі рэгіёна як адной з найважнейшых частак нацыянальнай самабытнасці Беларусі. Прымаюцца адпаведныя меры па захаванні і прымнажэнні гісторыка-культурнай спадчыны вобласці. У 2018 годзе Мінскім абласным саветам па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны прынята рашэнне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці з аднясеннем да катэгорыі «3» культурнай каштоўнасці — магіле святой блажэннай Валянціны Мінскай (1966 год), размешчанай на тэрыторыі могілак вёскі Забалацце Дзяржынскага раёна. Увогуле, культурная спадчына нашай вобласці матэрыялізавана ў 664 матэрыяльных нерухомых аб'ектах: 301 помніку археалогіі, 201 — архітэктуры, 155 — гісторыі, 1 — горадабудаўніцтва, 4 — мастацтва, 2 — запаведных месцаў. Ажыццяўляецца мэтанакіраваная праца па правядзенні рамонтна-рэстаўрацыйных работ на аб'ектах спадчыны. Так, за кошт сродкаў мясцовага бюджэту летась на рэканструкцыю з рэстаўрацыяй касцёла Божага Цела ў Нясвіжы накіравана 500 тыс. рублёў, на капітальны рамонт будынка былога дома дваранскага сходу ў Слуцку — каля 900 тыс. рублёў.

Духоўным і культурным капіталам незаменнай каштоўнасці з'яўляюцца нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека. Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены 12 аб'ектам нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Паказчыкам прэстыжу і гонару для Мінскай вобласці з'яўляецца ўключэнне каляднага абраду «Цары» вёскі Семежава Капыльскага раёна і ўрачыстасці ў гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай «Будслаўскі фэст» аграгарадка Будслаў Мядзельскага раёна ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Дынамічнае развіццё ў Мінскай вобласці мае адзін з галоўных складнікаў нацыянальнай культуры — традыцыйная народная творчасць. Усю жанравую палітру народнага мастацтва Міншчыны аб'ядноўвае абласны фестываль народнай творчасці «Напеў зямлі маёй» у Мар'інай Горцы. Сінтэзам народнай музыкі, фальклорнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляецца абласное свята «Нясвіжскі фэст» у Нясвіжы. Традыцыі народнай гульні і музыкі, гумару і весялосці дэманструе абласны фестываль гульні і гумару «Капыльскія пацехі» ў Капылі. Своеасаблівым сімвалам самабытнай традыцыйнай культуры з'яўляецца абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі», які штогод праводзіцца ў адным з гарадоў рэгіёна. У Мінскай вобласці эфектыўна падтрымліваюцца, адраджаюцца і развіваюцца народныя мастацкія рамёствы. На далучэнне насельніцтва да вытокаў народнага мастацтва, мастацка-рамесных традыцый рэгіёна накіравана правядзенне абласных культурных мерапрыемстваў: свята народных мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы» ў Слуцку, свята-конкурсу па ткацтве «Матчыны кросны» ў Старых Дарогах, свята-конкурсу майстроў ганчарства «Гліняны звон» у Івянцы Валожынскага раёна, свята-конкурсу майстроў драўлянай манументальнай скульптуры «Сонечная цеплыня дрэва». Штогод на тэрыторыі вобласці арганізуецца звыш 7 тысяч выставак, якія адлюстроўваюць разнастайную палітру народных мастацкіх рамёстваў рэгіёна: ткацтва, вышыўка, салома- і лозапляценне, ганчарства, пляценне паясоў, разьба па дрэве, выцінанка, бондарства. Важкі ўклад у вывучэнне і асэнсаванне гісторыі і культуры малой радзімы ўносяць дзяржаўныя музеі Мінскай вобласці. Вялікую цікавасць у наведвальнікаў музеяў выклікаюць пастаянныя экспазіцыі, сярод якіх «Гісторыя Міншчыны з самых старажытных часоў да пачатку XX ст.» Мінскага абласнога краязнаўчага музея, «Матэрыяльная і духоўная культура беларуса-сакуна пачатку XX стагоддзя» Старадарожскага гісторыка-этнаграфічнага музея, «Гісторыя вайны 1812 года на Барысаўшчыне. Бярэзінская пераправа» Барысаўскага аб'яднанага музея.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Тэндэнцыі

Беларусы сустракалі 2019-ы з добрым настроем і аптымізмам

Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта правёў сацыялагічнае апытанне наконт чаканняў беларусаў ад 2019 года. Навагодняе свята, як паказала даследаванне, жыхары Беларусі сустракалі пераважна з добрым настроем, пачуццём аптымізму. Аб гэтым БелТА паведамілі ў ІАЦ.

Апытанне праводзілася сярод дарослага насельніцтва Беларусі — ад 18 гадоў і старэйшых. На пытанне, з якім пачуццём сустракаеце Новы год, 64 працэнты рэспандэнтаў адказалі, што хутчэй з добрым настроем, пачуццём аптымізму. Каля чвэрці апытаных (28 працэнтаў) напярэдадні свята не адчувалі асаблівых эмоцый. Песімістычныя чаканні былі характэрныя толькі для 5 працэнтаў.

У ІАЦ звярнулі ўвагу, што з 2019 годам беларусы звязваюць пераважна пазітыўныя чаканні. «Большасць грамадзян (73 працэнты) глядзіць у будучыню з аптымізмам, мяркуючы, што 2019 год для краіны складзецца ўдала, а што ён будзе няўдалым (цяжкім), лічаць 13 працэнтаў апытаных», — праінфармавалі ў цэнтры.

Найбольш высокая доля аптымістычна настроеных грамадзян назіраецца сярод моладзі да 30 гадоў — 87 працэнтаў. Вераць у асабісты поспех у 2019 годзе 78 працэнтаў беларусаў. Лічаць, што год складзецца для іх цяжка, толькі 7 працэнтаў грамадзян.

Напярэдадні свята беларусы расказалі пра свае навагоднія жаданні. Перш за ўсё людзі хацелі б палепшыць сваё здароўе і матэрыяльнае становішча (42 працэнты і 39 працэнтаў адпаведна). Радзей яны строілі планы, звязаныя з паляпшэннем бытавых умоў, адпачынкам, змяненнем ладу жыцця. «Цікава, што сярод моладзі ва ўзросце 18—29 гадоў плануе стварыць сям'ю, абзавесціся дзіцем у 2019-м практычна кожны трэці — 30,5 працэнта», — падкрэслілі ў ІАЦ.

Дакладны падлік

УСЕ КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСІ

На публічнай кадастравай карце краіны з'явіўся новы тэматычны пласт

Уся работа над гэтым пластом, які з'явіўся сімвалічна ў Год малой радзімы, заняла каля двух месяцаў і стартавала з размяшчэння інфармацыі аб 68 крыніцах на тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

А ініцыятыва ўзнікнення новага пласта належыць Брэсцкаму агенцтву па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Яго спецыялісты не толькі сабралі афіцыйныя звесткі аб крыніцах рэгіёна, правялі здымкі каардынат і зрабілі іх апісанне, суправадзіўшы фатаграфіямі, але і добраўпарадкавалі тэрыторыю ў шэрагу крыніц.

Гэта цікавае пачынанне падтрымаў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці краіны Андрэй ГАЕЎ.** Ён жа даручыў спецыялістам Нацыянальнага кадастравага агенцтва (НКА) сабраць і сістэматызаваць прадастаўленыя рэгіянальнымі агенцтвамі звесткі. Згодна з інфармацыяй на 28 снежня, на публічнай кадастравай карце краіны адлюстраваны звесткі аб 553 крыніцах і іншых водных аб'ектах, якія маюць гістарычнае, геаграфічнае, прыроднае, экалагічнае, духоўнае і іншае значэнне. Больш за ўсё крыніц у Магілёўскай вобласці — 159. У Мінскай вобласці налічваецца 146 знакавых водных аб'ектаў, 90 — у Гомельскай вобласці, 70 — у Гродзенскай, 68 — у Брэсцкай, 19 — у Віцебскай вобласці. Адна крыніца зарэгістравана на тэрыторыі Мінска.

Для лепшай пазнавальнасці месцаў на карту дададзены фатаграфіі крыніц. Звесткі да цяперашняга часу працягваюць паступаць на адрас НКА, пласт на карце будзе абнаўляцца. Ініцыятыва Брэсцкага агенцтва па добраўпарадкаванні крыніц знайшла водгук у жыхароў рэгіёна, якія таксама прынялі ўдзел у арганізаваных спецыяльных суботніках.

Сяргей КУРКАЧ.

Марка да 100-годдзя БССР

Учора Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100 гадоў БССР». Урачыстая цырымонія гашэння адбылася ў Мінску.

Фота БелТА.

У ёй прынялі ўдзел міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган і акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя.

— Утварэнне БССР — гэта найважнейшая падзея ў жыцці краіны, якая мусіць заставацца ў памяці. Тое, што гэта адлюстравана ў выглядзе паштовай маркі, вельмі значна і неабходна», — зазначыў Канстанцін Шульган.

— Што такое стагоддзе? Гэта ўсяго толькі імгненне ў гісторыі, але за гэты час беларусы паспелі дасягнуць вельмі многага. Мы і нашы продкі зрабілі ўсё, каб Беларусь квітнела, — сказаў Аляксандр Каваленя.

Марка аддрукавана тыражом у 60 тысяч экзэмпляраў. Яе дызайн распрацавала Алена Мядзведзь. Намінал маркі адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна па тэрыторыі Беларусі.

А ў мінскім аддзяленні паштовай сувязі № 1 адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Культасвета

БІЛЕТЫ НА «ШЧАЎКУНКА»

Іх уладальнікамі стануць пераможцы сямейнага конкурсу «Навагодняя тэатральная цацка», зладжанага Вялікім тэатрам Беларусі ўжо пяты раз.

Як расказалі ў тэатры, сёлета цікавасць да творчага спаборніцтва была як ніколі вялікая: фантазію,

Работа сям'і Семчанка (лаўрэат I ступені).

Работа сям'і Кузняцовых (гран-пры).

натхненне, мастацкі густ і любоў да тэатра прадэманстравалі 120 сем'яў з Мінска, Віцебска, Магілёва, Чэрвеня, Оршы, Нясвіжа і многіх іншых гарадоў і пасёлкаў нашай краіны. 140 самаробных цацак, дасланых на конкурс, па традыцыі ўпрыгожылі ёлку, устаноўленую ў фае Вялікага тэатра. Сёння тут жа пройдзе і ўзнагароджанне пераможцаў. «Уладальнік Гран-пры, а таксама лаўрэаты I, II і III ступеняў атрымаюць нашы галоўныя прызы — магчымасць убачыць самы казачны балет Пятра Чайкоўскага «Шчаўкунок», — расказалі «Звяздзе» ў тэатры і далі, што ёсць яшчэ больш за 20 спецыяльных намінацый ад партнёраў і спонсараў праекта — пераможцы ў іх таксама атрымаюць падарункі.

Аўтарамі найлепшай навагодняй тэатральнай цацкі, на думку журы, стала сям'я Кузняцовых: браты Міхаіл і Арсеній, якія разам з мамай Ганнай стварылі з пап'е-машэ дзвюх старажытнагрэчаскіх муз: Мельпамену, якая апякуецца трагедыяй, і музу танца Тэрпсіхору. Першае месца атрымала сям'я Семчанка за сваіх казачных персанажаў — Бабу-Ягу і Гнома, другое — у Дар'і Філатавай і яе Мышыльды, трэцяе — у сям'і Ставер, якая прадставіла кампазіцыю «Балет», а прыз глядацкіх сімпатый атрымае сям'я Емяльянавых, якая даслала на конкурс сімпатычную вядзьмарку Ягуню.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прэс-службы тэатра.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

140 тысяч японцаў прыйшлі павіншаваць імператара з Новым годам

Больш за 140 тысяч чалавек прыйшлі павіншаваць імператара Японіі Акіхіта з Новым годам і паслухаць вітальныя словы манарха, паведаміла агенцтва «Кіёда». Колькасць наведвальнікаў стала рэкорднай з 1989 года, калі імператар Акіхіта заняў Хрызантэмавы трон. Такая вялікая колькасць наведвальнікаў звязана з тым, што імператар Акіхіта ў гэтым статусе Новы год сустракаць больш не будзе. Манарх з'явіўся на балконе на плошчы палацавага комплексу ў суправаджэнні імператрыцы Міціка, наследнага прынца Нарухіта і прынца Акісіна з сем'ямі, павіншаваў прысутных з Новым годам ды пажадаў міру і шчасця японскаму народу і людзям ва ўсім свеце. На працягу дня імператарская сям'я шэсць разоў выходзіла павітаць наведвальнікаў. Побач з комплексам былі ўсталяваны вялікія экраны, каб прысутныя маглі лепш бачыць тое, што адбываецца. Наступным імператарам Японіі стане старэйшы сын Акіхіта, прынц Нарухіта. Японскі ўрад абвесціць назву новай эры 1 красавіка, за месяц да таго, як новы імператар узыдзе на трон. Цяперашняя эра носіць назву Хэйсэй — эра Устанаўлення міру.

Балсанару паабяцаў «перабудаваць» Бразілію

Жаір Балсанару, які 1 студзеня ўступіў на пасаду прэзідэнта Бразіліі, паабяцаў «перабудаваць» краіну. «У нас ёсць унікальная магчымасць перабудаваць краіну. Сёння мы паставілі перад Бразіліяй складаную задачу — пачаць новую главу ў гісторыі, калі краіна стане моцнай», — заявіў Балсанару падчас свайго выступлення перад Палатай дэпутатаў Нацыянальнага кангрэса пасля ўступлення на пасаду. Яго трансляваў канал палаты. Па словах Балсанару, яго каманда мае намер працаваць без палітычнай прадузятасці, што зрабіла раней дзяржаву неэфектыўнай і карумпаванай. «Мы правядзём структурныя рэформы, якія будуць мець важнае значэнне для забеспячэння ўстойлівасці дзяржаўных фінансаў. Нам трэба адкрыць нашы рынкі для міжнароднага гандлю», — сказаў новы прэзідэнт. Балсанару, які вядомы прыхільнасцю да правых поглядаў, будзе кіраваць краінай з найбуйнейшай эканомікай у Лацінскай Амерыцы да канца 2022 года.

У ЕС спыняюць выпуск банкнотаў па 500 еўра

У Еўразоне з 27 студзеня 17 з 19 цэнтрабанкаў спыняць выпуск банкнотаў наміналам па 500 еўра. Пра гэта паведаміла France24 са спасылкай на паведамленне Еўрапейскага цэнтральнага банка. Аўстрыя і Германія будуць працягваць выпуск банкнот па 500 еўра да 26 красавіка для забеспячэння паступовага пераходу і па лагістычных прычынах. Адзначаецца, што спыненне выпуску такіх купюр павінна забяспечыць «плаўны пераход» на новыя стандарты. Пры гэтым банкноты ўсё яшчэ будуць прымаць як законны плацежны сродак. Цяпер «старэйшай» еўрапейскай купюрай павінна стаць банкнота ў 200 еўра. Як вядома, ЕЦБ абвясціў аб намеры спыніць выпуск 500-еўравых банкнотаў яшчэ ў маі 2016 года. Цэнтрабанк аргументаваў гэта тым, што менавіта такія банкноты часцей за ўсё выкарыстоўваюцца ў адмыванні грошай і фінансаванні тэрарызму. 500-еўравы банкнот з'яўляецца адным з самых каштоўных у свеце нароўні з банкнотам у тысячу швейцарскіх франкаў.

Рэпартаж

НАВАГОДНІ РЭЙД З «АХОВАЙ»,

або Начное дзяжурства журналіста ў кампаніі міліцыянераў і сабакі

Трэцюю запар навагоднюю ноч карэспандэнт «Звязды» праводзіць з міліцыянерамі. Пазалетась — з АМАПам, летась — у аператыўна-дзяжурнай службе УУС і ДАІ. А ў апошнія хвіліны адыходзячага года пачалося дзяжурства з супрацоўнікамі Дэпартамента аховы.

А дзе сабака?

Перад выездам з міліцыяй міжвольна хацелася (бадай, у тысячны раз) паглядзець камедыю «Іронія лёсу, або З лёгкай парай». Калі ў Жэні, галоўнага героя, традыцыя штогод 31 снежня хадзіць з сябрамі ў лазню, у мяне — па міліцэйскія рэпартажы. Чаму? З чаго? Падабаецца! І вельмі рады, што чарговы раз стаў спадарожнікам людзей, якія, як высветлілася, таксама любяць тое, чым займаюцца. Прызналіся, што «сядзець» на пастах ва ўстановах ім цяжка. А вось «ляцець» на аўто куды трэба — задавальненне.

У апошні перадНавагодні вечар фільм «Іван Васілевіч мяняе прафесію» з эпізодам пра сабаку быў якраз у тэму. Памятаеце: «Сабака з міліцыяй абяцаў прыйсці...»? Дзеля першага ў прынцыпе і вырашыў зрабіць чарговы навагодні рэпартаж. Тым больш што мне анансавалі дзяжурства з нямецкай аўчаркай — такой жа, як у кіно.

Каля 23.30 сеў у службовы «форд». Пазнаёміліся. **Алег ЗУЕЎ, міліцыянер-кіроўца групы затрымання Кастрычніцкага раённага аддзела Дэпартамента аховы горада Віцебска**, служыць каля чвэрці века ў адным аддзеле! Прыкладна палову навагодніх начэй — на службе. Яго напарнік — **міліцыянер-кінолаг групы затрымання, старшы сяржант Дзяніс БЯЛЯЕЎ**. Ён у міліцыі трэці год. Да гэтага быў таксама кінолагам — служыў ва ўнутраных войсках.

Едзем. Дык а сабака дзе? Аказваецца... у багажным аддзяленні. Ціхенька ляжыць, ні гуку. Думаў перад рэйдам, што сабака будзе гаўкаць, мітусіцца. Усё наадварот.

Абаяльны... спецсродак

Нямецкай аўчарцы па мянушцы Жан 2,5 года. Каб параўнаць з чалавечым узростам, трэба памножыць на шэсць. Па сабачых мерках — у самым росквіце. Каб выдрэсіраваць, трэба патраціць мінімум паўгода.

Кінолаг растлумачыў, што сабака, згодна са службовай інструкцыяй, прыраўноўвацца да спецыяльнага сродку абароны. Такі абаяльны «спецсродак» з хвастом. Калі зламыснік паспрабуе напасці на супрацоўніка міліцыі, абароніць, можна сказаць, «на аўтамаце». У справе затрымання ён таксама профі з вялікай літары. Ад яго не ўцячы. Калі дагоніць і зубамі зачэпіць, тут ужо прабачце, чалавек дарагі. Лёгка возьме след, без памылкі вызначыць, каму належыць рэч...

Калі няма работы, хвастаты вельмі дружалюбны і прыветлівы. Дзяніс Бяляеў кажа, што з Жанам перыядычна выступае на святах, у аздараўленчых летніках, школах. І на такіх паказальных выступленнях яго нават гладзяць.

А вось фатаграфавацца сабака, як мне падалося, не любіць. Вельмі цяжка кінолагу было яго паставіць, пасадзіць так, каб глядзеў у аб'ектыў.

Цікава, што некалькі тыдняў таму Жан дапамог раскрыць краданеж вялікай алюмініевай лесвіцы. А на першым дзяжурстве навёў на таго, хто скраў мотаблок... Дарэчы, бацька Жана, Карат, выйшаў на след мужчыны, які адкрыў стралянінy ў вёсцы. Вывеў на хату, дзе той схаваўся, знайшоў спачатку ружжо, потым і самога... стралка.

Жывуць сабакі ў гадавальніку. У тых, якіх бяруць на дзяжурствы, толькі адзін пастаянны кінолаг. Звычайна служаць хвастатыя каля дзесяці гадоў. Могуць і больш, калі здароўе дазваляе, не страчваюць нюх напрыклад. Але ці служыць далей — вырашае ветэрынарная камісія. Амаль як у людзей усё. На «пенсіі» экс-міліцэйскія сабакі звычайна жывуць у сваіх кінолагаў, іх знаёмых. Кормяць іх камбінавана: сухім кормам, кашамі. Сабакі любяць і садавіну, напрыклад яблыкі, агародніну. «Слабасць» Жана — сыр.

Дай, Жан, на шчасце...

Спачатку мы прыехалі да галоўнай плошчы Віцебска — Перамогі. Спрацавала сігналізацыя ў краме, дзе рэалізуюць у асноўным нехарчовыя тавары. Міліцыянеры па прыездзе правяраюць, ці пранік нехта ў памяшканне, кантралююць магчымыя шляхі адступлення зламыснікаў. Высветлілася: выклік звязаны з тым, што ад вібрацыі задрыжала шкло вокнаў. Прычына — феерверк.

Потым па рацыі паведамілі пра сігнал з бібліятэкі замежнай літаратуры. (Я там, дарэчы, ніколі не быў.) Прыехалі на месца прыкладна а трынаццатай хвіліне на першую гадзіну новага года. Ніякіх прыкмет узлому не ўбачылі. Пакуль мы з кінолагам ахоўвалі аб'ект, міліцыянер-кіроўца прывёз адказную работніцу. Вядома, было шкада прывабную маладую жанчыну, якой прыйшлося пакінуць святочнае застолле. Але ж трэба было падпісаць адпаведны акт. Пакуль афармлялі патрэбныя паперы, спрабаваў зрабіць з Жанам сэлфі на памяць ды пачытаць яму верш Ясеніна «Дай, Джым, на шчасце лапу мне...». Сабака паводзіў сябе дружалюбна, але добрае фота самому зрабіць не атрымалася. Дапамагла бібліятэкар.

У выпадках рэагавання на месца прывозяць і дзяжурнага электрыка ведамства. Той упэўніваецца, што сігналізацыя ў парадку, зноў яе падключае. Так было і гэтым разам. Калі везлі дамоў бібліятэкара, прасіла згадаць у артыкуле і іншага сабаку — Кая, які таксама з міліцыяй прыязджаў у бібліятэку. Праўда, не ў навагоднюю ноч.

Банк рабуюць?

Потым міліцыянеры праверылі пост аховы ў будынку абласнога суда, агледзелі знешні перыметр. Раптам быў атрыманы сігнал, што спрацавала сігналізацыя ў банку. Яны хутка заскочылі ў аўто, адзетыя, дарэчы, у бронекамізэлькі і цяжкія шлемы. Я ледзь паспеў за імі... Праўда, на выклік паехаў іншы экіпаж, які знаходзіўся бліжэй. Але ў банку нічога надзвычайнага не адбылося. Зноў жа сігналізацыя спрацавала ад вібрацыі, а такое можа здарыцца і ад моцнага ветру, і ад граду.

«Ахова» выязджае і ў выпадку, калі ўключаецца так званая «трывожная кнопка» ва ўстановах. Напрыклад, у кавярні хуліганяць, нейкі канфлікт — супрацоўнік націскае на кнопку, і міліцыя хуценька прыязджае. У горадзе нарматыў — да сямі хвілін.

Каля трох гадзін ночы мы пад'ехалі да дзіцячай стаматалагічнай паліклінікі. «Што ж там скрасці можна?» — пацікавіўся я. Камп'ютары, лекі... ды ці мала што. І зноў жа агляд перыметра, ці цэлыя вокны, дзверы. Кінолаг застаўся каля медыцынскай установы, а мяне адвезлі да карпункта. Пашкадаваў на развітанне, што не спрацавала сігналізацыя... у заапарку, дзе можна было б убачыць сімвал ужо бягучага года — свінак. Вось бы і сустрэліся хвастатыя «талісманы», калі мець на ўвазе, што адыходзячы год быў годам Сабакі. Прыкладна чатыры гадзіны дзяжурства прайшлі незаўважна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Даберманы з Германіі і...

Усяго ў Дэпартаменце аховы Віцебшчыны каля 130 сабак.

Цікава: а наогул, ці даўно іх выкарыстоўваюць у якасці памочнікаў міліцыі Прыдзвіння?

Як паведаміла **начальнік гісторыка-дэманстрацыйнай залы цэнтра культурна-выхаваўчай работы УУС Іна АБРАМАВА**, усё пачалося ў 1928 годзе. З Германіі прывезлі трох даберманаў. Іх выкарыстоўвалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку. Калі ў наш час той, хто працуе з сабакам, — кінолаг, тады была іншая пасада: спецыяліст-праваднік службовых сабак.

Але даволі хутка даберманаў прыйшлося замяніць на аўчарак, бо апошнія лепш працавалі ў лютыя маразы, тады ж надрукавалі інструкцыю па дрэсіроўцы.

У канцы 1930-х аўчарка з Віцебска па мянушцы Ірма стала пераможцай усебеларускіх конкурсаў. Знакамітасць 1970—1980-х гадоў — аўчарка Джульбарс, які раскрыў шэраг «гучных» злачынстваў. У канцы 1990-х спаніэль Бакс знайшоў буйную партыю наркотыкаў. За гэта малодшы інспектар-кінолаг Сяргей Прыхожы і сабака былі адзначаны на ўзроўні кіраўніцтва УУС.

Бяспека

ВА ЎЗМОЦНЕНЫМ РЭЖЫМЕ

Для гарантавання грамадскага парадку ў месцах правядзення святочных гулянняў прымаліся дадатковыя меры бяспекі. Было ўстаноўлена ачапленне і кантрольна-прапускны рэжым. Тэрыторыю правядзення мерапрыемстваў правяралі сапёрна-піратэхнічныя групы. У месцах гулянняў была павялічана шчыльнасць нарадаў міліцыі.

Каб пазбегнуць ДТЗ і затораў на дарогах, аўтатранспарт накіроўваўся па зменена схеме руху. На ўзмоцнены рэжым нясення службы было пераведзена каля дзесяці тысяч супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і вайскоўцаў унутраных войскаў.

— Новы год прайшоў спакойна, без грубых парушэнняў грамадскага парадку, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Дзмітрый КУР'ЯН.** — Непасрэдна ў месцах правядзення масавых мерапрыемстваў меры па спыненні правапарушэнняў прымаліся аператыўна, надзвычайных здарэнняў і злачынстваў зафіксавана не было.

Тым не менш ад няшчасных выпадкаў і праблем, звязаных з «чалавечым фактарам», застрахаваць не можа ніхто. Так, у аварыі ў Гродзенскім раёне загінула адна непаўналетняя дзяўчына. Яшчэ дзве дзяўчыны пацярпелі. ДТЗ адбылося 1 студзеня каля трох гадзін паблізу аграгарадка Азёры. 32-гадовы кіроўца аўтамабіля «Нісан Серэна», які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, не справіўся з кіраваннем і выехаў за межы праезнай часткі на сельскагаспадарчае поле, дзе машына перакулілася. У выніку чатырнаццацігадовая дзяўчына, якая знаходзілася ў аўтамабілі, ад атрыманых траўмаў памерла на месцы здарэння. Дзве шаснаццацігадовыя пасажыркі з цялеснымі пашкоджаннямі шпіталізаваныя.

1 студзеня быў знойдзены мёртвым у сябе дома ў Навагрудку ўладальнік сядзібы ў стылі фэнтэзі Сяргей Коваль. Знакамітая сядзіба была пабудаваная ім у вёсцы Літоўка пад Навагрудкам і выклікала неадназначнае стаўленне грамадзян. Як паведамілі ў Следчым камітэце, па гэтым факце праводзіцца праверка. Паводле папярэдняй інфармацыі, прыкмет крымінальнага характару здарэння не назіраецца. Прызначаная судова-медыцынская экспертыза, якая ўстановіць дакладную прычыну смерці.

Сяргей КУЛАКОЎ.

Камунальныя стасункі

ЯК БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ СЁЛЕТА ЗА ПАСЛУГІ

Электрычнасць для электрыфікаванага жылога фонду будзе ў разы таннейшая за дзеючыя тарыфы

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю пракаментавала Указ № 492 «Аб устанаўленні тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва на 2019 год». Такая інфармацыя змешчана на афіцыйным сайце міністэрства.

Гранічна дапушчальныя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва ў 2019 годзе ўстаноўлены з захаваннем асноўнага прынцыпу, згодна з якім штогадовы плацеж па тыпавой двухпакаёвай кватэры з трыма жыхарамі пры нарматыўным спажыванні паслуг не павінен павялічыцца больш чым на пяць долараў у эквіваленце.

«Цэны на асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва, па якіх у мінулым годзе дасягнута 100-працэнтнае пакрыццё затрат, павялічыліся не больш чым на 3,5 % (водазабеспячэнне, водаадвядзенне), а па асобных пазіцыях гранічна дапушчальныя тарыфы не змяніліся», — удакладняе міністэрства.

Зацверджаныя гранічныя ўзроўні тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва ў 2019 годзе дазволяць выйсці на ўзровень кампенсацыі па ўсім комплексе жыллёва-камунальных паслуг у памеры больш за 80 %.

Што даражэе ў гэтым годзе? Ацяпленне і абагравание вады для насельніцтва вырасце з 1 чэрвеня — да 18,4831 рубля за 1 Гкал. Да гэтага часу гранічны тарыф будзе ранейшы — 16,9259 рубля за 1 Гкал. Тарыф на капрамонт жылога дома вырасце да 0,1001 рубля за квадратны метр агульнай плошчы жылога памяшкання (зараз — 0,0953 рубля).

Цана за газ у дамах і кватэрах, дзе ёсць прыборы індывідуальнага ўліку расходу газу і індывідуальныя газавыя ацяпляльныя прыборы, у ацяпляльны перыяд складзе 0,1143 рубля за кубаметр з 1 студзеня да 31 мая ўключна, 0,119 рубля за кубаметр з 1 чэрвеня да 31 снежня. Пры адсутнасці індывідуальных газавых прыбораў тарыф складзе 0,4114 рубля за кубаметр газу (цяпер — 0,3275 рубля).

Калі ў доме ці кватэры не выкарыстоўваюцца прыборы індывідуальнага ўліку расходу газу, але ёсць газавая пліта і цэнтралізаванае гарачае водазабеспячэнне або індывідуальны воданагравальнік (за выключэннем газавага), цана складзе 3,29 рубля з аднаго чалавека ў месяц (цяпер — 2,62 рубля). Тарыф на газ у кватэрах (дамах), дзе ёсць газавая пліта і індывідуальны газавы воданагравальнік, але няма цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння, складзе 9,46 рубля на аднаго чалавека ў месяц, пры наяўнасці газавай пліты, адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка — 5,35 рубля (цяпер — 4,26 рубля). Пры адсутнасці індывідуальных газавых прыбораў тарыф складзе 0,4874 рубля за кубаметр газу ў ацяпляльны перыяд і 0,1824 рубля летам.

Кошт за кілаграм газу ў балонах вагой 21 кілаграм у межах нормаў спажывання складзе 0,7788 рубля. Балон будзе каштаваць 16,35 рубля (сёння — 13,02 рубля).

Плата за электраэнергію ў жылых дамах і кватэрах, абсталяваных электрычнымі плітамі, складзе 0,1484 рубля за 1 кВт·г (цяпер — 0,1218 рубля). Дыферэнцыраваны тарыф у такіх жылых памяшканнях у перыяд мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00) — 0,1039 рубля за 1 кВт·г (цяпер — 0,0853 рубля), а ў перыяд максімальных нагрузак (з 17.00 да 22.00) — 0,2968 рубля (цяпер — 0,2436 рубля).

Электрычная энергія для патрэбаў ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт у перыяд мінімальных нагрузак (з 23.00 да 6.00) складзе 0,1019 рубля за 1 кВт·г, у астатні час сутак — 0,1892 рубля (цяпер — 0,1863 рубля).

Тарыф на водазабеспячэнне падымуць з 0,8053 да 0,8338 рубля, на водаадвядзенне — з 0,6191 да 0,6383 рубля. Тарыф на тэхабслугоўванне жылога дома пакінулі на ранейшым узроўні.

З 1 студзеня падаражэў вываз смецця і складае 8,9169 рубля за кубаметр у дамах, абсталяваных працуючым смеццеправодам (цяпер — 8,8076 рубля), і 7,3333 рубля рубля за кубаметр у дамах з нефункцыяноючым смеццеправодам або без яго.

Акрамя таго, у мэтах стымулявання спажывання электраэнергіі ў краіне ўстанаўліваецца камфортны для насельніцтва тарыф на электрычную энергію для ацяплення і гарачага водазабеспячэння электрыфікаванага жылога фонду ў памеры 0,0335 рубля за 1 кВт, што значна ніжэй чым дзеючыя тарыфы.

Сяргей КУРКАЧ.

Добрыя навіны

Аптэчная сетка прапануе работу актыўным пенсіянерам

Абяцаюць заробак да 1500 рублёў

Чым старэйшы становіцца чалавек, тым больш ён адчувае сябе выключаным з грамадскага жыцця і тым часцей сутыкаецца з паблажлівым стаўленнем з боку маладзейшых, асабліва калі ён ужо не працуе. Многія і хацелі б знайсці работу на пенсіі, але пажылым людзям зрабіць гэта вельмі няпроста. Менавіта таму адна з аптэчных сетак вырашыла запусціць доўгатэрміновы праект «Старэйшы спецыяліст» і працаўладкоўваць людзей старэйшых за 50, якім з-за ўзросту адмаўляюць у рабоце.

«Аб'яўляем вакансію для мудрых правізараў і фармацэўтаў», — заявілі ў аптэчнай сетцы ADEL (холдынг «Аптэка Груп»). Тут гатовыя ўзяць людзей ва ўзросце, якія ўлюбёныя ў сваю прафесію, актыўныя і пазітыўныя. Ад саіскальніка чакаюць, што ён гатовы вучыцца новаму, глядзіць ролікі на «Ютубе», робіць зарадку раніцай і не «штурмуе» халадзільнік па начах. Яшчэ лепш, калі ён «любіць натхняць людзей, гатовы стаць прыкладам для тых, хто пакуль расце». «Нам патрэбен чалавек, які ўсім усё даказаў і цяпер можа проста быць сабой. А на пытанне: «Які час лепшы?» адказвае «У якім я цяпер», — гаворыцца ў вакансіі.

Ад саіскальнікаў патрабуецца закончаная вышэйшая або сярэдняя спецыяльная адукацыя па спецыяльнасці «фармацыя», адпаведныя веды і досвед працы з пакупнікамі. Вітаюцца адказнасць, высокая матывацыя, здольнасць да работы ў камандзе і гатоўнасць да навучання і прафесійнага развіцця.

Прэтэндэнты, якія пройдуць сумоўе, змогуць выбраць нагрузку — ад 0,25 і да 1 стаўкі. Ім таксама падбяруць аптэку блізка да іх дому. Зарплата — да 1500 рублёў у месяц.

«Мы хочам унесці ўклад у павышэнне сацыяльнай актыўнасці людзей старэйшага ўзросту. Вырашаючы адначасова праблему пошуку кваліфікаваных супрацоўнікаў, мы раскрываем патэнцыял і магчымасці людзей старэйшага ўзросту і хочам зруйнаваць існуючыя стэрэатыпы. Упэўнены, што вопыт, веды, погляд на жыццё людзей, якія не жадаюць старэць, будуць карыснымі і неацэннымі як для кампаніі, так і для пакупнікоў», — тлумачаць у аптэчнай сетцы.

Святлана БУСЬКО.

Будзь у курсе

ВЫРАСЛІ МІНІМАЛЬНЫ ЗАРОБАК І ШТРАФЫ

ШТО ЗМЯНІЛАСЯ З 1 СТУДЗЕНЯ

Разводзіцца будзе даражэй, незанятых чакаюць дадатковыя затраты на паслугі ЖКГ, а рэпетытары і ўладальнікі аграэкасядзіб, якія працуюць без афармлення ІП, змогуць запасіць сабе на пенсію.

У колькі абыдзецца шлюб і няправільная паркоўка

З 1 студзеня базавая велічыня выросла да 25,5 рубля. Дагэтуль яе памер складаў 24,5 рубля. Разам з базавай велічынёй выраслі і сумы дапамог, стыпендый, падаткаў і штрафаў, якія ад яе залежаць.

Так, павялічыўся максімальны памер дапамогі па беспрацоўі — з 49 да 51 рубля. Збор, які павінны плаціць беларусы, што займаюцца рамесніцтвам ці аграэкатурызмам, цяпер складае 25,5 рубля.

Дзяржпошліна за рэгістрацыю шлюбу стала роўнай 25,5 рубля. А вось развод сёлета абыдзецца ў 102 рублі.

Выраслі натарыяльныя тарыфы. Напрыклад, за сведчанне пагаднення аб выплаце аліментаў давядзецца заплаціць 102 рублі, шлюбнага дагавору — 153. А кошт выдачы пасведчання аб праве на спадчыну складае ад 25,5 да 127,5 рубля.

Падаражэлі рыэлтарскія паслугі. За дапамогу ў падрыхтоўцы дакументаў для здзелкі па продажы ці куплі кватэры або зямельнага надзелу з вас папросяць 765 рублёў (на 30 больш, чым год таму). А кансультацыя па здзелках з аб'ектамі нерухомасці каштуе цяпер 76,5 рубля.

Што да штрафаў, то за безбілетны праезд у гарадскім грамадскім транспарце давядзецца заплаціць ад 12,75 да 25,5 рубля. За гучную музыку, якая парушае спакой суседзяў, шум ад рамонту ў неналежны час з вас могуць спагнаць да 765 рублёў. Максімальны штраф за распіццё алкаголю ў грамадскіх месцах ці з'яўленне там у нецвярозым стане вырас да 204 рублёў (плюс 8 рублёў), а за знаходжанне нападпітку на рабочым месцы ў рабочы час — да 255 (плюс 10 рублёў).

Кіроўцам няправільная паркоўка будзе каштаваць 25,5 рубля. За перавышэнне хуткасці ад 10 да 20 кіламетраў у гадзіну давядзецца заплаціць да 25,5 рубля, а за перавышэнне на 30 кіламетраў у гадзіну і больш — ад 76,5 да 255 рублёў. Штраф за перавозку дзіцяці без дзіцячага крэсла — да 102 рублёў.

Для работнікаў і беспрацоўных

Вырас мінімальны заробак з 305 да 330 рублёў. Гэта сума — самая нізкая мяжа аплаты працы работнікаў пры занятасці ў нармальных умовах на працягу нармальнага рабочага часу пры належным выкананні абавязкаў. Калектыўным дагаворам можа быць прадугледжаны іншы мінімальны заробак, але не меншы за той, які ўстанавіў урад.

А вось тых, хто не працуе, чакаюць дадатковыя затраты. Ужо з 1 студзеня не занятыя ў эканоміцы грамадзяне будуць аплачваць па поўным тарыфе гарачае водазабеспячэнне. Даведвацца пра гэта яны будуць праз свае жыроўкі. Па папярэдняй інфармацыі, дадатковыя расходы на ЖКГ-паслугі закрануць каля 500 тысяч чалавек — менавіта столькі трапіла ў базу незанятых. Праверыць, ці ёсць вы ў гэтым спісе, можна на Адзіным партале электронных паслуг. Каб зайсці на сайце ў асабісты кабінет, спатрэбіцца персанальны лагін і пароль (іх бясплатна выдаюць у службе «Адно акно»).

Узносы ў ФСАН па новых правілах

Самазанятыя грамадзяне, якія займаюцца непрадпрымальніцкай дзейнасцю (напрыклад, рэпетытары, фатографы, цырульнікі, уладальнікі аграэкасядзіб), змогуць плаціць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і тым самым запасіць сабе на пенсію. Такое наваўвядзенне прадугледжана Указам № 500 «Аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні», які Прэзідэнт Беларусі падпісаў 27 снежня.

Дакумент таксама дае права індывідуальным прадпрымальнікам, натарыусам і адвакатам плаціць у ФСАН толькі за перыяд, калі яны фактычна працавалі і атрымлівалі даход. Дэкларавать перыяды ажыццяўлення сваёй дзейнасці трэба будзе раз на год, не пазней за 31 сакавіка года, наступнага за справаздачным, праз падачу ў фонд індывідуальнага ўліку.

— Увесці ў зман органы ФСАН не атрымаецца, паколькі пададзеныя ўказанымі катэгорыямі плацельшчыкаў звесткі будуць звярацца з іншымі дзяржаўнымі органамі, — папярэджваюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. — З гэтай мэтай будуць выкарыстоўвацца інфармацыйныя рэсурсы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, у тым ліку Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, базы даных падатковых, у банках будзе запытвацца інфармацыя аб руху сродкаў на бягучых рахунках.

ФСАН зможа таксама спаганяць запазычанасці з плацельшчыкаў узносаў з электронных кашалькоў.

Мінімальны страхавы плацеж для прадпрымальніка ў месяц (калі ён працаваў у гэты перыяд) складзе 115,5 рубля (35 % ад мінімальнага заробку), для самазанятай асобы — 95,7 рубля (29 %). У страхавы стаж залічаць толькі тыя перыяды работы, калі рабіліся ўзносы ў ФСАН.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ТРАДЫЦЫЯ РАБІЦЬ ДАБРО

Напярэдадні Каляд рабіць добрыя справы і адорваць сваёй увагай і клопатам тых, хто ў гэтым пасапраўднаму мае патрэбу асабліва важна. У рамках 15-га Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сёмы раз адбудзецца дабрачынная акцыя «Калядная традыцыя».

Каманды-ўдзельніцы хакейнага турніру ў суботу наведаюць дзіцячы дом № 7 «Сем Я» ў Мінску, дзе пражываюць 63 дзіцяці ад 3 да 18 гадоў. Установе ўжо пералічана матэрыяльная дапамога ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і Федэрацыі хакея на агульную суму 32 тысячы рублёў. Выхаванцы дзіцячага дома таксама атрымаюць падарункі ад усіх дванаццаці камандаў-удзельніц і запрашэнні на фінальны матч. Звычайна гэта мерапрыемства не абыходзіцца без танцаў, песень, усмешак, добрых слоў і пажаданняў.

Нагадаем, акцыя «Калядная традыцыя» ўпершыню прайшла падчас 9-га Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея і з таго часу стала ўжо традыцыйнай.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Спорт-тайм

ТЭНІСІСТЫ ПАЧАЛІ НОВЫ СЕЗОН

У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных і першых дзён 2019 года.

1. Арына Сабаленка (13-ы нумар сусветнага рэйтынга) паспяхова пачала выступленне на турніры ў кітайскім Шэньчжэні з прызавым фондам 626 тысяч доларaў. У паядынку 1/16 фіналу беларуска, пасеяная пад першым нумарам, абыграла нямецкую тэнісістку Тацяну Марыю — 3:6, 6:3, 6:1. А ў матчы за выхад у чвэрцьфінал Арына абыграла расіянку Кацярыну Аляксандраву — 6:3, 6:3. Наступнай саперніцай стане таксама расіянка Марыя Шарапава.

У парным разрадзе гэтых спаборніцтваў беларуска Лідзія Марозава і японка Сюко Ааяма выйшлі ў 1/4 фіналу, перамогшы кітайскі дуэт Чжа Хюі Чэнь / Дань Ні Ван — 6:2, 6:4.

Аляксандра Сасновіч адкрыла сезон выступленнем на турніры ў аўстралійскім Брысбене з прызавым фондам 900 тысяч доларaў, а Вікторыя Азаранка на спаборніцтвах з прызавым фондам 250 тысяч доларaў у новазеландскім Оклендзе (прайграла амерыканцы Вінус Уільямс).

На мужчынскім турніры ў індыйскай Пуне беларус Ягор Герасімаў не здолеў прабіцца ў асноўную сетку.

2. Чэшскі спецыяліст Марцэл Лічка афіцыйна стаў галоўным трэнерам футбалістаў брэсцкага «Дынама». Новы кантракт з ім падпісаны на адзін сезон з магчымасцю яго падаўжэння яшчэ на год.

Нагадаем, Марцэл Лічка пачаў працаваць у брэсцкім «Дынама» год таму, а з жніўня ўзначаліў трэнерскі штаб. Разам з чэхам работу ў наступным сезоне працягнуць усе асістэнты, якія працавалі з дынамаўцамі з другой палове 2018 года.

Пад кіраўніцтвам Марцэла Лічкі брастаўчане правялі 14 афіцыйных матчаў, атрымаўшы 8 перамог, тройчы згуляўшы ўнічыю і пацярпеўшы столькі ж паражэнняў. У чэмпіянаце Беларусі брэсцкае «Дынама» заняло 6-е месца. На старце мінулага сезона брэсцкія дынамаўцы заваявалі Суперкубак, а затым выйгралі Кубак Беларусі, у абодвух выпадках абыграўшы чэмпіёна краіны барысаўскі БАТЭ.

3. Нападаючы зборнай Аргенціны і іспанскай «Барселоны» Ліянэль Месі стаў найлепшым бамбардзірам года ў Еўропе. У 2018-м 31-гадовы аргенцінец забіў 51 мяч у 54 матчах за нацыянальную зборную і «Барсу». Гэта чацвёрты падобны поспех Ліянэля Месі — да гэтага ён станавіўся найлепшым снайперам у 2010 (60 галоў), 2012 (91) і 2016 (59) гадах.

Другім у 2018 годзе стаў партугалец Крыштыяну Раналду, які забіў 49 мячоў у 53 гульнях за зборную сваёй краіны, мадрыдскі «Рэал» і турынскі «Ювентус». Трэцяе месца ў польскага форварда мюнхенскай «Баварыі» Роберта Левандоўскага, у яго актыве 46 мячоў у 56 сустрэчах.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЗАВЕРЕНО
Департаментом
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
27.12.2018 г.
Красинский А. Д.

Краткая информация
об эмиссии жилищных облигаций второго выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ЭЛЕДИ Компани» (ООО «ЭЛЕДИ Компани»)

1. Общие сведения об эмитенте.

1.1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на русском и белорусском языках).

На русском языке:

полное наименование – Общество с ограниченной ответственностью «ЭЛЕДИ Компани»;

сокращенное наименование – ООО «ЭЛЕДИ Компани» (далее по тексту – Эмитент).

На белорусском языке:

полное наименование Эмитента – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЭЛЕДЗІ Компані»;

сокращенное наименование Эмитента – ТАА «ЭЛЕДЗІ Компані».

1.2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):

1.2.1. Адрес места нахождения Эмитента: 220100, г. Минск, ул. Кульман, 11, офис 103;

1.2.2. Телефон/факс: +375 (17) 289-55-20, +375 (17) 289-55-33, электронный адрес (e-mail) – eledi@nvv-group.by.

1.3. Эмитент зарегистрирован (в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей внесена запись о государственной регистрации Эмитента) Каменецким районным исполнительным комитетом 01.09.2015 с регистрационным номером 291300033.

1.4. Денежные средства, подлежащие внесению в оплату стоимости жилищных облигаций второго выпуска Эмитента (далее по тексту при совместном упоминании – «Облигации», при упоминании по отдельности – «Облигация»), уплачиваются в безналичном порядке в белорусских рублях по следующим банковским реквизитам Эмитента: расчетный счет № BY93TECN30121693300000000010 (BYN), открытый в ОАО «Технобанк», БИК: TECNBY22, адрес банка: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.

1.5. Депозитарием Эмитента, с которым заключен депозитарный договор, является Открытое акционерное общество «Технобанк» (далее по тексту – депозитарий Эмитента), место нахождения: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44. ОАО «Технобанк» зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 05.08.1994, регистрационный номер № 47, специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-1246-1155 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

1.6. В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Уставом Эмитента, утвержденным решением Общего собрания участников ООО «ЭЛЕДИ Компани» (протокол от 10.10.2017 № 1, государственная регистрация Устава осуществлена Минским городским исполнительным комитетом, регистрационный номер 291300033, дата регистрации 11.10.2017) (далее по тексту – Устав), Эмитент вправе осуществлять любые виды деятельности, не запрещенные законодательством Республики Беларусь. Основным видом деятельности, осуществляемым Эмитентом на дату утверждения Решения о втором выпуске жилищных облигаций, является реализация проектов, связанных со строительством зданий.

2. Сведения об эмитируемых эмиссионных ценных бумагах.

2.1. В соответствии с законодательством Республики Беларусь и Уставом Эмитента органом Эмитента, уполномоченным на принятие и утверждение решения о выпуске эмиссионных ценных бумаг, является Общее собрание участников Эмитента.

Решение о втором выпуске жилищных облигаций принято внеочередным Общим собранием участников Эмитента 07.09.2018 (протокол № 9 от 07.09.2018) и утверждено внеочередным Общим собранием участников Эмитента 01.11.2018 (протокол № 10 от 01.11.2018).

2.2. Номер выпуска, форма, количество, номинальная стоимость Облигаций, объем выпуска Облигаций.

Облигации второго выпуска Эмитента – жилищные именные бездоходные конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме.

Количество Облигаций в выпуске – 2 000 (две тысячи) штук.

Облигация имеет номинальную стоимость в размере 1 652 (одна тысяча шестьсот пятьдесят два) белорусских рубля и эквивалент номинальной стоимости, равный 1 (одному) квадратному метру общей площади жилого помещения в многоквартирном крупнопанельном 9-этажном жилом доме № 1 по генплану (2-я очередь строительства) в составе следующего объекта: «Строительство двух многоквартирных, четырехсекционных жилых домов со встроенными торгово-бытовыми и административными помещениями в г.Фаниполь».

Объем выпуска Облигаций составляет 3 304 000 (три миллиона триста четыре тысячи) белорусских рублей.

Доход по Облигациям, в том числе при погашении (досрочном погашении), не начисляется и не выплачивается.

2.3. Дата государственной регистрации выпуска Облигаций и государственный регистрационный номер выпуска Облигаций указываются в проспекте эмиссии Облигаций.

2.4. Эмиссия Облигаций осуществляется с целью привлечения денежных средств юридических и (или) физических лиц на осуществление строительства многоквартирного крупнопанельного 9-этажного жилого дома № 1 по генплану (2-я очередь строительства) в составе следующего объекта: «Строительство двух многоквартирных, четырехсекционных жилых домов со встроенными торгово-бытовыми и административными помещениями в г. Фаниполь» (далее по тексту – «Жилой дом № 1 по генплану»), а также для финансирования хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением функций застройщика (заказчика), в том числе возмещения ранее понесенных затрат на строительство, на иные расходы и для финансирования иных мероприятий, связанных со строительством Жилого дома № 1 по генплану, а также с возможностью временного размещения денежных средств, полученных от открытой продажи (размещения) Облигаций, на банковские депозитные счета, открытые на имя Эмитента.

Эмитент обязуется использовать средства, привлеченные путем эмиссии Облигаций (полученные от продажи Облигаций), исключительно на вышеуказанные цели.

2.5. Способ обеспечения исполнения обязательств Эмитента по Облигациям, сведения об обеспечении.

Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечивается страхованием ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента Облигаций:

Договор № 005087-18/3134 от 01.10.2018 г. добровольного страхования ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств эмитента облигаций (далее по тексту – «Договор страхования») с общим лимитом ответственности на сумму 3 304 000 (три миллиона триста четыре тысячи) белорусских рублей заключен с Белорусским республиканским унитарным страховым предприятием «Белгосстрах», 220036, г. Минск, ул. К. Либнехта, 70, УНП 100122726 (далее по тексту – «Ведущий страховщик») и со страховым обществом с ограниченной ответственностью «Белкоопстрах», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 17, УНП 100706519 (далее по тексту – «Состраховщик»). Срок действия Договора страхования – по 30.09.2020 г.

Лимит ответственности Ведущего страховщика по Договору страхования составляет 2 643 200 (два миллиона шестьсот сорок три тысячи двести) белорусских рублей.

Лимит ответственности Состраховщика по Договору страхования составляет 660 800 (шестьсот шестьдесят тысяч восемьсот) белорусских рублей.

Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям действует в течение всего срока обращения Облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока их обращения, за исключением случаев исполнения Эмитентом обязательств по Облигациям в полном объеме до истечения указанного трехмесячного срока.

2.6. Срок размещения, срок обращения, дата начала погашения Облигаций.

Дата начала размещения (открытой продажи) Облигаций – 01.11.2018.

Дата окончания размещения (открытой продажи) Облигаций определяется как дата размещения (продажи) последней Облигации Эмитента и ее списания со счета «депо» Эмитента, но не позднее 01.05.2020.

Срок обращения Облигаций – 607 календарных дней, с 01.11.2018 по 30.06.2020.

Дата начала погашения Облигаций – 30.06.2020.

Погашение Облигаций производится в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, сформированном депозитарием Эмитента на 20.06.2020.

2.7. Способ размещения Облигаций.

Размещение Облигаций осуществляется на неорганизованном рынке путем открытой продажи физическим и (или) юридическим лицам на основании соответствующего договора купли-продажи.

Облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения Облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с Эмитентом Договор на строительство жилого помещения, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилых помещений в Жилом доме № 1 по генплану.

Эмитент осуществляет размещение (открытую продажу) Облигаций самостоятельно ежедневно в рабочие дни (за исключением выходных дней, государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 11, офис 103.

2.8. Профессиональным участником рынка ценных бумаг, услуги которого использовались при подготовке Проспекта эмиссии Облигаций, является Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (ЗАО «Агрокапитал»), место нахождения: г. Минск, ул. Революционная, 6В; телефон/факс: +375 (17) 209-42-59, +375 (17) 209-42-60; электронный адрес: depo@depo.by. ЗАО «Агрокапитал» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 18.08.2000 № 931, регистрационный номер 101000004. Директором ЗАО «Агрокапитал» является Яцкевич Александр Джонович.

ЗАО «Агрокапитал» действует на основании специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-1246-1097 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь.

2.9. Основание, по которому Эмитентом может быть принято решение о признании эмиссии Облигаций несостоявшейся, порядок возврата денежных средств владельцам Облигаций (инвесторам) в случае признания выпуска Облигаций недействительным, запрещения эмиссии Республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг, признания эмиссии Облигаций Эмитентом несостоявшейся, условия и порядок досрочного погашения Облигаций, порядок погашения облигаций, порядок обращения облигаций, условия и порядок приобретения Облигаций Эмитентом до даты начала погашения облигаций с возможностью их последующего обращения, а также порядок и условия конвертации Облигаций данного выпуска в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения содержатся в Проспекте эмиссии Облигаций.

3. Порядок раскрытия эмитентом проспекта эмиссии Облигаций.

С Проспектом эмиссии Облигаций, содержащим более подробную информацию об эмиссии Облигаций, можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни (за исключением выходных дней, государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 17.00 по адресу, указанному в пункте 2.7. настоящего документа, обратившись к сотрудникам офиса продаж Эмитента.

При обращении к Эмитенту с целью ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций потенциальному инвестору представляется Проспект эмиссии Облигаций и/или заверенная копия Проспекта эмиссии Облигаций для обозрения (чтения).

Директор Эмитента	Соколовский Виталий Станиславович
Главный бухгалтер Эмитента	Курбаева Наталья Юрьевна

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторного открытого аукциона (первоначальная цена снижена на 50 %)

Лот № 1: Капитальное строение с инв. №730/С-570 (магазин) площадью – 76,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Космонавтов магазин «Продукты». Земельный участок с кадастровым номером 724050100001000256 площадью – 0,0120 га.

Начальная цена продажи: 10 800,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1 080,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион состоится 25 января 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 24 января 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона
Расчетный счет для внесения задатка	Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: Торговое унитарное предприятие «Могилевская межрайбаза», УНП 700188685, г. Могилев, пр-т Димитрова, 31А

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 10 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 01.09.2018 и 27.10.2018

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 29 624-26-25, +375 29 550-09-56

Адна сустрэча

«Хай нашы дзеці вырастуць свядомымі»

«Ходзіць дзед белабароды // Полем, лесам, пералескам, // Засцілае рэчкі лёдам, // Брыльянцістым снежным блескам. // Сыпле іней на бярозы, // Туліць дрэвы лёгкім пухам, // Крые руні, травы, лозы // Белай посцілкай-кажухам...»

Гэты верш Якуба Коласа яго малодшы сын Міхась Канстанцінавіч не раз чытаў і сваім дзецям-унукам-праўнукам, і чужым. Гучаў ён і на адной з творчых сустрэч у музеі класіка, прычым у голасе Міхася Канстанцінавіча было столькі душэўнага цяпла, што яно лёгка перадавалася слухачам — разам з яркай карцінай іх утульнага сямейнага побыту.

— У нашай сям'і і сапраўды панавалі добрыя, паважлівыя адносіны, — гаворыць Міхась Канстанцінавіч. — Мама, Марыя Дзмітрыеўна, вельмі клапацілася пра ўсіх. Бацька, напрыклад, дрэнна спаў ноччу (максімум тры-чатыры гадзіны), затое меў звычку адпачыць пасля абеду. Мама сачыла, каб у хаце ў гэты час было ціха, каб яго ніхто не турбаваў. Яна вельмі хвалявалася за татава не багатырскае здароўе: ён 26 разоў перанёс запаленне лёгкіх, яшчэ ў турме нажыў хваробу страўніка. Для яго мама купляла мёд у сотах. І наогул яна была вельмі добрая, сціплая, уважлівая — і да нас, сваіх сямейнікаў, і да чужых людзей.

Колас таксама быў прыкладам бацькі: заўсёды гутарыў з намі, цікавіўся справамі, чытаў нам кніжкі, падтрымліваў захапленні... Любіў ён і гаспадарыць: пілаваць ды секчы дровы, чысціць ад снегу сцежкі... Пасля вайны пасадзіў чатыры дубочкі, а паміж імі — бярозку. І назваў іх: Даніла, Міхась, Юрка, Колас і Марыя. Гэтыя дрэвы і сёння растуць каля музея, толькі маміна бярозка засохла...

Неяк мне прапанавалі напісаць пра маму ўспаміны, і шкада, што матэрыялаў аказалася зусім няшмат: яна, паўтараруся, была вельмі сціплая, старалася нічым не вылучацца. Ды і не расказвалі нам бацькі пра тое, што ў іх жыцці было... Праўда, пра адзін цікавы момант я даведаўся. Аднойчы мама знайшла ў бацькавай кішэні запісную кніжачку, поўную любоўных вершаў. Допыт ладзіць не стала, толькі спытала: «Костусь, гэта што такое?». Бацька мякка, але настойліва пачаў даказваць, што вершы прысвечаны ёй. «Я разумею, што мне, — адказала яна. — Але чаму ты пасля вяселля нічога не напісаў?..»

Гэты эпізод ёсць у маёй кнізе «Пад бацькоўскім дахам».

— У вас таксама былі далікатныя адносіны з жонкай?

— Так, мы рэдка калі спрачаліся, хоць у нечым былі і рознымі. Напрыклад, яна была савою, позна клалася спаць, а я — жаўрук, яна любіла гуляць у карты, я — не...

— А як вы пазнаёміліся?

— Мы тады былі студэнтамі Маскоўскага авіяцыйнага інстытута. Наташа, прыехаўшы да бацькоў у Мінск, забылася тут студэнцкі пропуск. Янка Маўр, яе бацька, папрасіў мяне завезці, а я, аддаючы дакумент, узяў ды ляпнуў, што на фотакартачцы яна прыгажэйшая...

— «Добры» пачатак... Але ж пасля вы не пакінулі дзяўчыну без знакаў увагі?

— Так, яна мне адразу запала ў душу. Мы сталі сустракацца. Потым было вяселле, 65 гадоў сумеснага жыцця і галоўнае багацце — трое нашых дзяцей: Сяргей, Канстанцін і Марыя.

На вялікі жаль, шэсць гадоў таму Наташы не стала. Яна была вельмі добрая, разумная жанчына і клапатлівая маці.

— Я неяк бачыла вас у філармоніі. Вы вельмі ўважліва слухалі музыку.

— О, я яе вельмі люблю! У дзяцінстве мама прымушала мяне граць на скрыпцы, але ахвоты, на жаль, не было. Класы чатыры сяк-так правучыўся... Праўда, хадзіў на ўсе выступленні, якія ладзіліся ў музычнай школе. А неяк мама павяла мяне ў парк Горкага на канцэрт філарманічнага аркестра. Дырыжыраваў Аркадзь Бяссмертны. Гучала «Кампанела» Ліста, «Фарандола» Бізэ... Я быў узрушаны гэтай музыкай! З тых часоў і стаў прыхільнікам класікі, што, дарэчы, вельмі зблізіла нас з Наталляй. Мы да паўночы маглі слухаць канцэрты з конкурсаў шапэнаўскай музыкі... Пазней, калі сталі распаўсюджвацца запісы, куплялі пласцінкі Моцарта, Вівальдзі, Бетховена. Гэта цудоўна! Слухаеш — і душа напаўняецца радасцю...

Вельмі любілі і фільмы з удзелам майстроў опернай музыкі Ціта Гобі, Беньяміна Джылы. Потым з'явіліся Лучана Павароці, Хасэ Карэрас, Марыя Калас. Слоў не знайсці, каб перадаць прыгажосць гэтых галасоў!..

Наша захапленне перадалося малодшаму сыну Кастусю. Ён паў-

зарплаты, відаць, аддае на запісы, грунтоўна ведае музыку, можа нават лекцыі чытаць па музыказнаўстве. Мы не ўключаем радыё, бо цяпер эфір забіваецца безгалосая папса. Па вечарах слухаем Афенбаха, Расіні, Вердзі, Даніцэці. Боская музыка!

— Бачу на вашым стале мноства выдатных, па-майстэрску зробленых вамі фотаздымкаў, псіхалагічных фотапартрэтаў, шмат рукапісаў... Скажыце, над чым працуеце зараз?

— Пачаў рыхтаваць для Беларускай энцыклапедыі матэрыял аб акружэнні Коласа. Тут трэба шмат папрацаваць, ахапіць ташкенцкі і маскоўскі перыяды, напісаць пра людзей, якія бывалі ў нас. Гэта вельмі вялікая праца. Але ж, калі Бог дасць сілы, напішу.

— На вечарах паэзіі вы па памяці чытаеце велізарныя ўрыўкі з паэм «Новая зямля», «Сымон-музыка», цікава расказваеце розныя бываліцы. Гэта ў вас ад бацькі?

— У мяне сапраўды каля сотні эпіграм і прысвячэнняў маім сябрам. Многія з іх цяпер і не ўспомню, бо не запісаў. Але сёе-тое захавалася.

— А яшчэ вы захапляецеся кулінарыяй.

— Так. Наташа была цудоўная гаспадыня, вельмі смачна гатавала. Мы з ёй любілі бываць у кампаніях, часта збіралі сяброў, асабліва пасля таго, як я прывозіў з паляванне якую-небудзь дзічыну: качак, цецярукоў, зайцоў.

Але... Неяк яна была на курсах павышэння кваліфікацыі ў Баўманскім інстытуце, я застаўся гаспадарыць ды так і прывык. Памятаю, паехаў з сябрам у грыбы ў Налібоцкую пушчу, набраў два кашы. Дома падлічыў: 1440 цудоўных зялёнак і падзялёнак! Самыя лепшыя адабраў для засолкі, астатнія адварыў, дробна парэзаў курынае мяса, дадаў яго да грыбоў разам з цыбуляй і паставіў тушыць. Потым, гатовае, заліў сметаннай падліўкай — атрымалася такая смаката! Патэлефанаваў сябру: «Хочаш смачна паесці — прыходзь!» Дык той нават прыбег! Мы з ім усё і з'елі. Гэта была цудоўная страва!..

Пазней я прачытаў кнігу вядомага фінскага міколага Мауры Корханена «100 грыбоў». Там напісана, што іх гатуюць з мясам фазана. А ў мяне была курыца: я сам прыдумаў, што яе так можна гатаваць.

— Напэўна, гэта не першая ваша рацыяналізатарская вынаходка ў галіне кулінарыі?

— Не. Аднойчы пасля ўдалага палявання на возеры Белым я зрабіў незвычайны паштэт з качак. Да мяса дадаў печань, сэрца, сала, цыбулю, макарону, патушыў, пракруціў на мясарубцы і запёк. Атрымалася вельмі смачна!..

З ежай я шмат эксперыментаваў: варыў кашу з гарбуза, яблыкаў і проса, да астаткаў грачанай кашы дадаваў крыху мукі, соды, пагашанай кефірам, яйка і пёк бліны. Бацька, дарэчы, расказваў, што грачанікі гатавала яго маці, а мая, значыць, бабуля. Тое ж можна зрабіць з рэшткаў прасянай кашы.

— Прадчуваю, якім поспехам будуць карыстацца гэтыя стравы, бо, некага імі частуючы, можна будзе з гонарам сказаць: маўляў, зроблена па рэцэпце Міхася, сына Якуба Коласа!

— Буду толькі рады! Я наогул многае магу гатаваць. Толькі пірагі пячы не ўмею, але ж калі б захацеў, то спёк бы, бо нездарма людзі кажуць, што млын моцны вадой, а чалавек — ядой. Ва ўсім свеце лічыцца, што найлепшыя кухары — мужчыны. Я ведаў аднаго акадэміка, які пёк цудоўныя піражкі з капустай і грыбамі.

А ў нашай сям'і заўсёды было шмат розных нарыхтовак. Засольвалі, напрыклад, па 20 літраў чорных груздоў. Смаката! І на ўсю зіму выдатны дадатак да бульбы! Збіралі травы для гарбаты... У прыродзе шмат карыснага, да ўсяго цяжка дайсці сваім розумам, патрэбна падрыхтоўка. І ва ўсім павінна быць логіка, абгрунтаванне — як у навуцы, так і ў жыцці.

— Дзякуй вам за каштоўныя жыццёвыя парады. Але ж хочацца хоць трохі пазнаёміцца з той сур'ёзнай навукай, якой вы прысвяцілі больш за паўстагоддзя свайго жыцця, працуючы ў Акадэміі навук Беларусі, напісаўшы больш за 150 работ і зрабіўшы каля 20 адкрыццяў!

— Калі коратка, я займаўся вывучэннем асноў і магчымасцяў электрафізічных метадаў апрацоўкі металаў (з дапамогай электрычнай іскры). Гэта незвычайна загадкавая з'ява — электрычная эрозія металаў! Быў назапашаны значны аб'ём найкаштоўнейшай навуковай інфармацыі, засвоена некалькі простых тэхналагічных працэсаў, якія знайшлі прымяненне на многіх заводах краіны. Распрацоўкі нашай лабараторыі запатрабаваныя навуковымі цэнтрамі Расіі, Украіны, вядомыя ў ЗША і Еўропе.

Згадзіцеся, зайздросны лёс у майго суразмоўніка! Бацька — класік беларускай літаратуры; маці — настаўніца; старэйшы брат Даніла быў навукоўцам-хімікам; сярэдні — Юрый да вайны вывучаў геаграфію. Сам Міхась Канстанцінавіч — вядомы вучоны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Яго нябожчыца-жонка Наталля Іванаўна шмат гадоў выкладала ў Палітэхнічным інстытуце. Дачка Марыя абрала матэматыку, унучка Васіліна — сацыялогію, старэйшы сын Сяргей — інжынер-канструктар, малодшы Канстанцін — выкладчык рускай і беларускай моў.

Міхась Канстанцінавіч ганарыцца тым, што дачка, сын і ўнучка скончылі БДУ з чырвонымі дыпломамі. З гэтай нагоды ён напісаў жартоўны вершык: «Хай нашы дзеці вырастуць свядомымі // І прокладуць жыццёвы шлях свой самі. // Хай свеціцца яны чырвонымі дыпломамі, // А не чырвонымі насамі».

Валянціна ПАЛІКАНІНА.

Пасля пісьма

КАЛІ ЁСЦЬ ПЫТАННІ, АДКАЗ ЗНАЙСЦІ МОЖНА

«У 1998 годзе праводзіўся капітальны рамонт нашага дома, выдзяляліся сродкі на замену вокнаў, аднак самой замены не было. Адкуль пытанне першае: дзе вокны? Другое: дзесяцігоддзямі мы штомесяц робім адлічэнні на капітальны рамонт. Куды ідуць гэтыя грошы, калі рамонту 20 гадоў не было і ў наступныя 10, відаць, не будзе?» — пытаў у сваім лісце ў рэдакцыю С. М. Карабухін.

Зварот мінчаніна быў накіраваны ў адміністрацыю Фрунзенскага раёна Мінска, адкуль паведамілі наступнае: «Дзяржаўнае прадпрыемства «Жыллёвая камунальная гаспадарка № 2» (далей — ЖКГ № 2) арганізоўвае работы па капітальным рамонце ў адпаведнасці з Праграмай капітальнага рамонту жыллёвага фонду, распрацаванай РУП «Інстытут «Белжылпраект» на 2016—2020 гады (далей — Праграма) на падставе тэхнічнага задання ЖКГ № 2. Праграма з'яўляецца асноўным дакументам для фарміравання бягучых графікаў капітальнага рамонту па выніках фактычнага выканання плана рамонтна-будаўнічых і праектных работ у папярэдні перыяд. Згодна з Праграмай капітальны рамонт жылога дома № 26 па вул. Прытыцкага не ўключаны ў пералік аб'ектаў капітальнага рамонту жыллёвага фонду ЖКГ № 2, бо праведзены ў 1996—1998 гадах у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства і будаўнічых нормаў, якія дзейнічалі ў той перыяд часу.

Зараз капітальны рамонт праводзіцца ў жылых дамах 1974—1975 гадоў пабудовы.

Згодна з Палажэннем аб парадку разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2014 г. № 571 (далей — Палажэнне), плата за капітальны рамонт у шматкватэрным жылым доме ўносіцца плацельшчыкам жыллёва-камунальных паслуг штомесяц для кампенсацыі выдаткаў па капітальным рамонце ў долі суразмерна агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія яму належаць і (або) ім займаюцца, — па тарыфах для насельніцтва, якія субсідуюцца.

Згодна з п. 27 Палажэння сродкі ад унясення плацельшчыкамі жыллёва-камунальных паслуг платы за капітальны рамонт залічваюцца на спецыяльныя рахункі, адкрытыя (якія адкрываюцца) мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, альбо на рахункі таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў у мэтах акумулявання гэтых сродкаў для будучага фінансавання і (або) пакрыцця выдаткаў на правядзенне капітальнага рамонту жылых дамоў.

Сродкі, атрыманыя ад унясення платы за капітальны рамонт, маюць мэтавае прызначэнне і накіроўваюцца на мэты, устаноўленыя заканадаўствам, а таксама на плату і ўзнагароджанне банка за абслугоўванне рахункаў, адкрытых для акумулявання сродкаў ад унясення платы за капітальны рамонт.

Працэс выканання работ на аб'ектах капітальнага рамонту ажыццяўляецца бесперапынна, цэлы год і без адсялення грамадзян. Сістэма арганізацыі капітальнага рамонту з'яўляецца размеркавальнай і не мае на ўвазе назапашванне сродкаў, якія адлічваюцца грамадзянамі, у тым ліку і адлічэнне на капітальны рамонт ад уласнікаў нежылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў жылых дамах. Гэтыя сродкі ўвесь час знаходзяцца ў абароце, г. зн. пры паступленні на спецыяльны (разліковы) рахунак ЖКГ № 2 накіроўваюцца на разлікі з падраднымі арганізацыямі, што забяспечвае пастаяннае штогадовае выкананне работ па капітальным рамонце жыллёвага фонду.

Згодна з п. 26 Палажэння занесеная плацельшчыкамі жыллёва-камунальных паслуг плата за капітальны рамонт вяртанню не падлягае.

У ходзе сустрэчы, праведзенай у адміністрацыі Фрунзенскага раёна, заяўніку дадзены тлумачэнні па ўсіх пытаннях, якія яго цікавяць.»

НАВАГОДНЯЕ СВЯТЛО

Будзе магчымасць — абавязкова спытаю ў касманаўтаў, якой яны бачылі нашу Зямлю ў навагоднія святы. Асабліва цікавіць мяне, як выглядае начны Мінск, бо ў гэтыя дні нават міжнародныя тэлеканалы адзначылі надзвычайную прыгажосць нашай сталіцы.

А пакуль што — фотаапарат у рукі і наперад: здыму сам начны партрэт Мінска. Прайдуся па цэнтральных вуліцах. Пагляджу, як ззяюць гірлянды, пераліваецца святло на навагодніх ёлках, прывабліваюць яркія рэкламы на вулічных шапіках ды міні-кафэ, зіхацяць іскрынкамі бенгальскія агні.

Яўген ПЯСЕЦКІ.



2019

Беларуская газета
ЗВЯЗДА

ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ

Фота Анатоля Клешчука

Студзень

П	А	С	Ч	П	С	Н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Люты

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28			

Сакавік

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

Красавік

П	А	С	Ч	П	С	Н
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

Май

П	А	С	Ч	П	С	Н
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Чэрвень

П	А	С	Ч	П	С	Н
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30

Ліпень

П	А	С	Ч	П	С	Н
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

Жнівень

П	А	С	Ч	П	С	Н
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

Верасень

П	А	С	Ч	П	С	Н
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30						

Кастрычнік

П	А	С	Ч	П	С	Н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Лістапад

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	

Снежань

П	А	С	Ч	П	С	Н
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

Простая мова

КАХАННЕ СВЯТОЕ І ГРЭШНАЕ

У метро вагоны прасторныя. Праўда, днём гэтага амаль не заўважаеш — народу шмат, а вось позна ўвечары...
На лаўках ля процілеглай «сцяны» сядзіць (падлічылі) васямнаццаць чалавек (пустыя месцы таксама ёсць), шаснаццаць з іх — уткнуліся ў мабільнікі, адзін — у нейкі канспект. На тое, што робіцца навокал, глядзець, як быццам, няма каму?

ПОШУК

Горад. Вуліца. На праезнай частцы — паток машын, на тратуары — людзей. Адна «спіна» дык нават знаёмая? Лена ці што? Але ж не, відаць, бо яна — маладая, незамужняя, заўжды на абцасах, а гэта жанчына — з палачкай...

Смела абганяем і ўслед сабе чуем:

— Э-э, пастойце!

Выходзіць, Лена?

У яе — расказвае — праблемы з нагамі: костачкі «павылазілі». Надоечы «паўаперацыі» перанесла, бо «паправілі» толькі левую нагу. Але ж досыць удала: яна і не кульгае, можна сказаць. А што з палачкай, дык гэта на ўсякі выпадак: з ёю па снезе зручней і нават... выгадней, бо месца саступаюць. І ў чэргах стаяць не даводзіцца — прапускаюць наперад. «А неяк адзін мужчына (прычым цвярозы!) дык нават сумку маю паднёс, — па сакрэце расказвае Лена. — Аж да самага дома! Жанаты, на жаль, таму ў госці не зайшоў. Але я праз пару месяцаў зноў да хірурга пайду — з другой нагою. Можа, яшчэ хто дамоў правядзе?»

І застанецца.

ЁСЦЬ ПРАПАНОВА...

Праспект. Скрыжаванне. Падземны пераход. На заснежаных прыступках мужчына-пабірака — з голай галавой, бо шапка ў яго каля ног, побач з кардонкай, на якой напісана кароткае: *«На еду. Спасибо».*

— Ну, хоць бы не падманваў! — праходзячы міма, абураецца нейкая цётка. — На выпіўку ж просіць — на твары напісана!

...Адзін з мастакоў-гумарыстаў нібы падслухаў яе: намаляваў акурат такога жабрака — з кардонкай: «Вып'ю за ваша здароўе».

Ёсць прапанова, значыць, будзе і попыт?

З ІМ І БЕЗ ЯГО

Нядзелька. Дом. Званок у дзверы. На парозе — суседка. Гэтым разам — з вялікім качаном капусты.

— Во, з рынка ледзь «прыкаціла», — хваліцца яна, кіруючы ў кухню і ўжо там цяжка апускаючы ношу на стол.

— Палавіну галоўкі, — расказвае, — хацела сабе пакрышыць, а палавіну — маме занесці. Нож — во гляньце — загнала па самае дзяржанне і не выцягну, хоць ты плач! Можа, Мікалаевіч паспрабуе?

— А што тут спрабаваць, — не разумее муж, — узяў ды выцягнуў. (Заадно разрэзаўшы качан.) Прычым ён — «гуляючы», адной левай...

Тое, што суседка не зрабіла дзвюма.

...Цяжка ёй без мужчыны. Але ж гэта — сама прызналася — разумееш потым, калі пажывеш. Бо спачатку, пішучы заяву на развод, менш за ўсё думаеш пра тое, як прывалачэш з рынку гародніну, як паправіш кран альбо памяняеш лямпачку...

Ці дастанеш нож — з вялікага качана капусты.

МАМА ВЫЙШЛА ЗАМУЖ

Дом, вечар, тэлевізар — навіна з крымінальнай хронікі: у распусных дзеяннях у дачыненні да дзіцяці падазраецца айчым.

Гэта — што называецца — у кадры. За кадрам...



Фота Віктара СТРАЛКОЎСКАГА.

Маці гэтай дзяўчынкі, ну напэўна ж, разышлася некалі з яе родным бацькам (бо ён, відаць, дрэнны быў)...

Знайшла лепшага?

МЯЛІ, ВАСПАНЕ...

Юбілей, паводле слоўніка, — гадавіна, якая вылічваецца дзесяцігоддзямі. Іншыя даты, на тую ж «пяцёрку», больш правільна было б называць круглымі, прыгожымі, ганаровымі.

...Якраз такую, здаецца, святкуе вядомая артыстка тэатра і кіно — у прысутнасці гасцей, на тэлебачанні. Яна — як заўсёды — прыгожая, у прыгожым адзенні і ў кветках. А што да слоў, дык тут сам Бог загадаў: таленавітая (нават геніяльная), мудрая, самаахвярная... «Яна дапамагла...», «Яна прытуліла...», «Вывела ў людзі...».

І пры ўсім пры тым, як сама яна прызнаецца, быў перыяд, калі цяжка хварэла, калі, зусім не могучы, з сынам-падлеткам ішла выступаць, бо інакш ім проста не было б чаго есці...

Дзе тады былі гэтыя «прамоўцы» — калегі, вучні, сябры?

Ці язык без касцей. І гаварыць можна ўсё?

ЕСЦІ НЕ ЕХАЦЬ?

...Ну, ніякай логікі: і хлебапечка свая, і хлеб купляем, бо як жа ўстрымацца, калі ў крамах ён (гатовенькі, свежы) то з вельмі карысным, як пішуць, вотруб'ем, то з кменам-каляндрай, то з морквай, то з лёнам-часнаком (не кажучы ўжо пра арэхі, чарнасліў і курагу...), калі часам сама назва яго кажа, што вось гэты — «Ранак» — сама тое на сняданне, гэты — на абед (бо «Абедзенны»), а той — «Для стройнай фігуры» — відаць, на вячэру?

Не абы што — як трэба разумець — прадаюць і пад кідкай назваю *«Гонар»?* Тым больш што зверху, над назвай, яшчэ і шматабяцальнае *«Знатны Пачастунак»* (абодва словы з вялікай літары).

А вось знізу ўжо — «Хлеб пшеничный зерновой нарезанный»...

Бо калі б *«Пшанічны зерневы нарэзаны»,* то людзі не разумелі б, ці што? Адмовіліся б купляць?

Аднак у тое ж метро, дзе ўсе абвесткі гучаць па-беларуску, яны чамусьці спускаюцца — ездзяць...

Дык, можа, і хлеб з'елі б?

Ёсць пытанне, як той казаў. Няма адказу.

НЕ ЎСЁ ТОЕ СОНЦА...

Некалі гарталі, перабіралі старонкі кніг, цяпер куды часцей — тэлеканалы.

На адным з расійскіх — блізкая тэма — будаўніцтва каркасных дамоў.

Пачыналі іх, трэба разумець, з падмуркаў, з вытворчасці тых самых каркасаў. Але гэта мы прапусцілі. Цяпер на экране — сам працэс зборкі і самі «зборшчыкі». Прыгожа працуюць! «Але ж бывае і брак?» — у аднаго з майстроў (і, вядома ж, па-руску) пытае вядучы. — «Не без яго», — прызнаецца будаўнік. — «І што тады?»

Адказ амаль даслоўны:

— *Да известное дело: где-то клин, где-то мох... А иначе плотник ничего не заработал бы!*

Адказ, па ўсім выглядае, разумны, шчыры, але ж мог быць яшчэ і прыгожы. Калі б гэты «плотнік» не абцяжарваў сябе перакладам, калі б сказаў: (як у сук уляпіў!) наша спаконвечнае — тое што, пэўна ж, чуў ад бацькі, ад дзеда ці ад тых, хто вучыў яго справе: «Каб не клін і не мох, цесля б з голаду здох».

Хай бы ўсміхнуліся і вядучы, і гледачы, хай бы даведаліся, што будаўнік гэты — родам з Беларусі. І славіцца яна не толькі біятланістамі ды прыгажунямі, але і мудрымі гумарыстамі, майстрамі, якіх зусім не выпадае называць простымі.

ЧАСУ — МАЛА...

«Распродаж», «Акцыя», «Ліквідацыя калекцыі», «Зніжкі», «Дзве ўпакоўкі па цане адной»...

Іншымі словамі (і з усіх бакоў): «Калі ласка, зайдзіце! Калі ласка, купіце!»

Прычым зазывалы падпільноўваюць не толькі на вуліцы, за парогам дома, яны ўжо ўнутры, бо гэта раней тэлевізар ды інтэрнэт забіралі ў нас толькі час. Цяпер яны паціху «выцягваюць» грошы.

КАХАННЕ СВЯТОЕ І ГРЭШНАЕ

Блытае людзей сусветная павуціна! Ці самі яны ў ёй блытаюцца? Была, казалі, жанчына, як жанчына: мела мужа, дзяцей, добрую работу, нават пасаду...

З-за яе — як думаў муж — і «дома не стыкаецца»: позна прыходзіць, усё нейкія паперы піша, за камп'ютарам сядзіць.

Здавалася: што ў тым дрэнна га, пакуль, напісаўшы заяву на звальненне, яна не стала пакаваць чамадан ды казаць, што каханне знайшла — сапраўднае, незямное, узаемнае, а таму — пытанне жыцця і смерці — павінна ляцець...

З месяц яе дома не было (муж чорны хадзіў), а потым — вярнулася: нешта не зраслося з каханнем тым...

Дзеці, вядома ж, рады былі, муж — прыняў, работа знайшлася (хоць ужо і з меншым заробкам). Калегі, як народ інтэлігентны, у роспыты не кідаліся — соль на раны не сыпалі.

Але ж праўду кажуць, што волас сівее, галава шалее: зноў «аб'явіўся» той самы каханы, закідаў лістамі — ды з такімі пяшчотнымі словамі, з такімі абяцанкамі-цацанкамі...

Жанчына яшчэ раз звольнілася і яшчэ раз, як той матылёк, паляцела на агонь, да чорта на рогі.

Гэтым разам крылцы абгарэлі хутчэй: дамоў (бо куды ж яшчэ, калі дзеці...) праз два тыдні вярнулася.

Муж яшчэ раз прамаўчаў. Хіба на работу не пусціў (ды яна і не хацела, бо сорамна...).

Удваіх цяпер жывуць (дзеці вучыцца паступілі). Яна больш гаспадаркай займаецца — у інтэрнэце ўжо не сядзіць. Іншае захапленне мае: хустачку на галаву і за пяць вёрст у царкву — можа, каяцца, можа, маліцца — за дзяцей сваіх і... мужа, чые пачуцці зразумела толькі цяпер, «пасля ўсяго», на 20-м годзе сумеснага жыцця.

ПЯЦЬ КАПЕЕК

«Купіць зямлю, прыдбаць свой кут...» — гэта цяпер не праблема, калі грошы ёсць.

У прыяцелькі іх было мала, а лецішча набыць хацелася, побач... з Мінскам.

З яе тады многія смяяліся: маўляў, нічога ў цябе не выйдзе. А яна працягвала шукаць і такі знайшла! Праўда, цяпер — увесь час «будуецца»...

З драбязы пачынала: з прыбіральні, з ганка, з агароджы. А пад восень, можа, і лазню ўжо згарусцілі б, аднак тут, як на ліха, веранда ад хаты «ад'ехала». Гаспадар з сынам сталі падмурак мацаваць, гаспадыня — бульбу збіраць (дажджом на гародзе вымыла).

...Што цікава — не толькі яе. Пад нагамі ў жанчыны штось бліснула, яна падняла: манета — старая.

— Э, хлопцы, можа, мы не там капаем? — спытала ў сваіх мужчын. — Можа, трэба вось тут?

Сышліся, усе разам разгледзелі знаходку — пятак... На жаль, не залаты, але ж мінулае стагоддзе, трыццаць пяты год!

— Можа, прададзім? — загарэлася гаспадыня.

Мужчыны тут жа зазірнулі ў інтэрнэт, высветлілі, што ўтаргуюць зусім няшмат — аўчынка вычынкі не варта.

— Ну, тады я на памяць яе пакіну, — вырашыла жанчына. — З сабой буду насіць: ледзь што — у мяне пяць капеек.

Валянціна ДОЎНАР.

...Вось і ў мяне яны «з сабою» — з нейкай нагоды пяць, з нейкай мо тры...

Часам яны збіраюцца разам — у падборкі «Простай мовы» (і нават у дзве аб'ёмныя кніжкі!), часам — незваротна губляюцца. І думаеш: не, каб запісаць! Адразу... І надрукаваць — пад той жа рубрыкай — «Пяць капеек»? Раптам яны некаму спатрэбяцца — на ўсмешку, на роздум... Ці проста так?

Спроба не хвароба, як той казаў: дагнаў не дагнаў, а прабегчы можна.

Цікава, што на гэта скажа чытач.

Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кировске 14 февраля 2019 года

Аукцион состоится 14 февраля 2019 года в 10.00 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 2-й этаж, кабинет 34

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией)	Кадастровый номер	Стоимость документации (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	на углу Пушкинской и Ленинской улиц города Кировска Могилевской области	0,0698	25 лет	для размещения здания многофункционального (код 1 99 99, земельный участок неустановленного назначения)	722550100001003305	1678,63	3116,76	623,35

Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

При оформлении заявления и соглашения о правах, обязанностях и ответственности сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы: документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков)** на расчетный счет главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Могилевской области № BY76AKBB36007170000180000000, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 700451296 (разовый платеж), **с отметкой банка**; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность;

Представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

У маладосці Ян атрымаў добрую адукацыю. Вучыўся ён у Кракаўскім і Лейпцыгскім універсітэтах, служыў у імператарскім войску. Пасля вяртання ў Вялікае княства Ян Хадкевіч у 1560—1561 гадах ахоўваў лівонскі замак Люцен. У 1563 годзе, пасля неаднаразовых просьбаў жамойтаў, Жыгімонт Аўгуст назначыў яго на пасаду старасты жамойцкага, якую раней займаў ягоны бацька Геранім Хадкевіч. Вызначыўся Ян Геранімавіч у бітве з маскоўскім войскам каля ракі Ула 20 студзеня 1564 года. Кардынал Камендоне ў данясенні Папу Рымскаму адзначыў і яго «таленавітага не толькі вялікім розумам, але і вайсковай здатнасцю». А вялікі князь перадаў яму ў 1566 годзе пасаду маршалка земскага.

Значнай справай Яна Хадкевіча было канчатковае далучэнне Лівоніі да Вялікага Княства Літоўскага. На Берасцейскім сойме ў 1566 годзе было вырашана паслаць Хадкевіча ў Лівонію, ён атрымаў вялікакняжацкія паўнамоцтвы. Хадкевіч склікаў у Вендэне сойм усіх лівонскіх станаў і выступіў перад дэлегатамі. У сваёй прамове ён нагадаў, што менавіта з-за Лівоніі літвіны настроілі супраць сябе такога небяспечнага ворага, як Іван Грозны, і ў вайне з ім страцілі Полацк. А таму справядліва, каб лівонцы вернасцю і добразычлівасцю былі годныя пратэкцыі ВКЛ. Адмовіўшыся ад некаторых сваіх правоў, злучыліся з Вялікім княствам і сталі адной з ім дзяржавай ды адным народам. Пасля нядоўгіх спрэчак лівонцы пастанавілі: «У будучым не аддзяляцца ад Вялікага Княства Літоўскага, а быць у цеснай уніі, прыязні і братэрстве з Літвою. Нікога не прызнаваць сваім уладаром, апроч вялікага князя літоўскага, і ніякіх трактатаў супраць гэтай уніі не заключаць». Вендэнская унія была зацверджана 22 снежня 1566 года на Гарадзенскім сойме.

У Лівоніі Ян Хадкевіч правёў тэрытарыяльна-адміністрацыйную рэформу і выбары сенатараў і земскіх суддзяў, секулярызаваў землі рыжскага біскупства, адкрыў школы і прытулкі для бедных. Менавіта ў дыпламатычнай і адміністрацыйнай рабоце і праявіўся талент дзяржаўнага дзеяча Хадкевіча. Хоць ён і быў смелым і мужным чалавекам, але славы ваенных перамог не прыдбаў.

У 1567 годзе Ян Хадкевіч узначаліў аблогу пабудаванай на Полаччыне цвержы Ула. Шляхта без ахвоты ішла на штурм. Так што Хадкевіч асабіста «прозьбою и добротою» вёў яе ў бой, гатовы «там горло отдать». Цвержу ўзяць не ўдалося, але мужнасць Хадкевіча прызнаў сам Іван Грозны. У сваім лісце да яго маскоўскі ўладар пісаў: «Чуў пра твой вялікі розум і храбрасць пад Улаю і дзівіўся, як ты храбра там паводзіў сябе». А Жыгімонт Аўгуст у 1568 годзе за «накладанае старанье» надаў Хадкевічу «тытул, зацность і выменье, то есть грабство» на Шкловe і Мышы.

Галоўныя свае баталіі вёў Ян Хадкевіч на дыпламатычным фронце. Шырокія веды па гісторыі і філасофіі, дар красамоўства, прыродны розум — вось зброя, якой ён змагаўся. Гэты «Сцыпіён Літвы», як называлі яго сучаснікі, выстаяў пад шалёным націскам польскай шляхты і магнатэрыі, калі яны ў 1569 годзе на Люблінскім сойме дамагаліся поўнай інкарпарацыі Вялікага княства ў склад Польскага каралеўства. Пасланцам з іншага часу выглядаў Ян Хадкевіч сярод раз'юшаных польскіх паноў і шляхты, гатовых на ўсё абы «зняволіць» Літву. Падман, сіла, нахабнасць і хітрасць сустрэліся з высакароднасцю і рыцарствам Яна Хадкевіча. Сваю мэту на сойме, дзе ён узначаліў літвінскую дэлегацыю, Хадкевіч вызначыў гэтак: «Нам трэба рупіцца, каб пакінуць нашай маці — Рэчы Паспалітай Літоўскай і нашым нашчадкам памяць, як верна і зычліва мы служылі ім не толькі справамі, але і мудрымі парадамі, каб пакінуць нашчадкам наша добрае імя».

Дзякуючы намаганням Хадкевіча ўдалося адстаяць тытул вялікага князя, свой урад і сенат, свае законы, дзяржаўныя пячаткі і скарб, сваё войска. Вялікае Княства Літоўскае не ўвайшло як правінцыя ў склад Каралеўства Польскага і захавала сваю дзяржаўнасць. Рэч Паспалітая ўяўляла сабой федэрацыю дзвюх дзяржаў Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага пад уладай агульнага ўладара і з супольным соймам.

Асабліва ўзрасла палітычная вага Яна Хадкевіча ў часы першых безгаспадарстваў. Пасля смерці ў 1572 годзе Жыгімонта Аўгуста, Хадкевіч і Мікалай Радзівіл Руды ўзначальвалі ўрад Вялікага Княства Літоўскага. Суровай рукой Хадкевіч трымаў край у спакоі. Асабіста вяршыў суд над ліхадзеямі і злачынцамі. У паездках па дзяржаве яго суправаджалі дванаццаць катаў, якія выконвалі прысуд бязлітаснага суддзі. І край не захлынула хваля разбою і ліхадзейства. Пад наглядам Хадкевіча і Рудога дзяржаўны механізм Вялікага княства працаваў без перабояў.

Пасля ўцёкаў у ліпені 1574 года караля Генрыха Валуа ў Францыю Хадкевіч выступіў як адзін з галоўных палітыкаў, ад якога залежаў лёс кандыдатаў на карону Рэчы Паспалітай. Яму прапаноўвалі вялікія грошы, але не падкупілі. Інтарэсы Бацькаўшчыны — вось чым кіраваўся Ян Хадкевіч. Ён прыняў бок сяміградскага ваяводы Стафана Баторыя. Хадкевіч пераконваў паноў і шляхту абвясціць Баторыя вялікім князем літоўскім, які не мае «злога вока на Літву» і пераканаў іх. Ад імя Вялікага княства Літоўскага Хадкевіч прад'явіў Баторыю ўмовы, прыняўшы якія той мог стаць вялікім князем літоўскім. Баторый прынёс прысягу ў выкананні ўсіх ранейшых прывілеяў Вялікага Княства і прызнаў яго самастойнасць ад Польшчы. Выракся ён на карысць княства ад гаспадарскіх уладанняў. Ад імя Вялікага княства Хадкевіч абвясціў Стафана Баторыя вялікім князем літоўскім і прынёс яму клятву.

Паміж Баторыем і Хадкевічам усталявалася блізкае супрацоўніцтва. Амаль па ўсіх «великоважных справах земских» звяртаўся Баторый па раду да Хадкевіча. Апошняе, што паспеў ён зрабіць для краіны, — выставіць у войска ВКЛ для паходу на Полацк свой аддзел у 900 вершнікаў. Памёр «Сцыпіён Літвы» 4 жніўня 1579 года. Беларускі пісьменнік і палітычны дзеяч Хведар Еўлашэўскі вельмі трапна сказаў пра Яна Хадкевіча: «Вялікі пан, а манархам справамі сваімі роўны».

Вітаўт ЧАРОПКА.

Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь абвяшчае конкурс работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года

Вылучэнне і прадстаўленне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь, афармленне дакументаў і прыкладаемых да іх матэрыялаў павінны адпавядаць дадзенаму Парадку вылучэння і прадстаўлення работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года, распрацаванаму ў адпаведнасці з Палажэннем аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 года № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь» (у рэдакцыі Указа ад 6 снежня 2014 года № 589)

Парадак вылучэння і прадстаўлення работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года

1. Агульныя палажэнні

1.1. Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржаўная прэмія) з'яўляецца сведчаннем вышэйшага прызнання заслуг дзеячаў навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры перад грамадствам і дзяржавай.

1.2. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь адзін раз у чатыры гады (пачынаючы з 2016 года) прысуджае грамадзянам Рэспублікі Беларусь:

тры Дзяржаўныя прэміі ў галіне навукі і тэхнікі за выдатныя работы, адкрыцці і навуковыя дасягненні, вынікі якіх істотна ўзбагацілі айчынную і сусветную навуку і тэхніку, зрабілі істотны ўплыў на развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу і павышэнне эфектыўнасці эканомікі, забеспячэнне здароўя насельніцтва і аховы навакольнага асяроддзя;

тры Дзяржаўныя прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за глыбокія па змесце і адметныя па форме выдатныя работы (творы літаратуры, мастацтва і архітэктуры, дасягненні выканаўчага майстэрства), якія істотна ўзбагацілі нацыянальную і сусветную культуру, садзейнічалі ўсталяванню агульначалавечых каштоўнасцей і ідэй гуманізму.

Памер адной прэміі складае 3500 базавых велічынь. Пры вылічэнні грашовага памеру Дзяржаўнай прэміі прымаецца памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень уступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій.

1.3. Вылучаныя на саісканне Дзяржаўных прэмій работы прымаюцца да разгляду Камітэтам па Дзяржаўных прэміях (далей – Камітэт) пры ўмове, што іх вынікі рэалізаваны на практыцы (надрукаваны, асвоены вытворчасцю, пабудаваны, абнародаваны шляхам публічнага паказу, выканання ці іншым чынам) не менш чым за два гады да спынення прыёму работ на конкурс, г. зн. да 1 кастрычніка 2017 года.

1.4. Аўтарскі калектыў работы, вылучаемай на саісканне Дзяржаўнай прэміі, не можа перавышаць шасці чалавек, творчы ўклад якіх у работу з'яўляецца найбольш значным.

Не дапускаецца ўключэнне ў калектыў саіскальнікаў асоб, якія ажыццяўлялі ў працэсе выканання работы толькі адміністратыўныя, кансультатыўныя або арганізацыйныя функцыі.

Дапускаецца прадстаўленне работ, вылучаных або ўдастоеных другіх міжнародных і іншых прэмій.

Работы, у папярэднія гады дапушчаныя да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій, але не атрымаўшыя неабходнай колькасці галасоў для рэкамендацыі аб яе прысуджэнні, у наступныя гады могуць быць вылучаны паўторна, пры ўмове адпаведнасці патрабаванням, прад'яўляемым да работ Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 года № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь».

1.5. Работы, вылучаемыя на саісканне Дзяржаўных прэмій 2020 года, прымаюцца да разгляду Камітэтам да 1 кастрычніка 2019 года.

2. Вылучэнне і прадстаўленне работ

2.1. Прадстаўленне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій ажыццяўляецца калегіямі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, калегіяльнымі органамі кіравання іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, а Дзяржаўных прэмій у галіне навукі і тэхнікі таксама Прэзідыумам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па матэрыялах вылучэння ўваходзячых у іх склад, падпарадкаваных або падведамасных арганізацый.

У выпадку, калі работа вылучаецца арганізацыяй, якая не мае ведамаснай прыналежнасці, прадстаўленне работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі ажыццяўляе Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а на саісканне Дзяржаўных прэмій у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры – калегія Міністэрства культуры, з іх ліку: літаратурных твораў – разам з калегіяй Міністэрства інфармацыі, твораў архітэктуры – разам з калегіяй Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

2.2. Вылучэнне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій ажыццяўляецца на пасяджэннях калегій, прэзідыумаў, сакратарыятаў праўленняў творчых саюзаў, мастацкіх, рэдакцыйна-выдавецкіх, навукова-тэхнічных, навуковых саветаў, на сходах калектываў работнікаў па месцы працы саіскальнікаў (суб'ектамі вылучэння на саісканне Дзяржаўнай прэміі). Абавязковым з'яўляецца ўдзел у пасяджэнні прадстаўнікоў арганізацый, якія карыстаюцца вынікамі работы, вылучаемай на саісканне Дзяржаўнай прэміі.

Работа можа быць вылучана сумесна калектывамі некалькіх арганізацый, пры гэтым па агульнай згодзе адна з іх вызначаецца як галаўная, іншыя – як сумежныя суб'екты вылучэння.

2.3. Фарміраванне калектыву саіскальнікаў Дзяржаўнай прэміі праводзіцца з удзелам усіх аўтараў работы. Вылучэнне саіскальнікаў у аўтарскі калектыў з агульнага ліку выканаўцаў работы ажыццяўляецца зыходзячы з ацэнкі творчага ўкладу кожнага з іх. У аўтарскі калектыў уключаюцца аўтары, чый творчы ўклад у выкананне работы быў найбольш значны. Не дапускаецца ўключэнне ў аўтарскі калектыў асоб, якія выконвалі толькі адміністратыўныя, кансультатыўныя або арганізацыйныя функцыі.

Кандыдатура кожнага члена аўтарскага калектыву павінна быць абмеркавана па месцы яго асноўнай працы.

2.4. Рашэнне аб вылучэнні работы прымаецца адкрытым галасаваннем.

Рашэнне аб уключэнні кандыдатур у калектыў саіскальнікаў прымаецца шляхам тайнага галасавання пры наяўнасці кворуму, прынятага ў арганізацыі, дзе адбываецца вылучэнне.

2.5. Змяненні ў складзе аўтарскага калектыву вылучаемай работы павінны праводзіцца з абавязковым выкананнем працэдур, прадугледжаных пунктамі 2.1. – 2.4. гэтага Парадку.

3. Камплектацыя прадстаўляемай работы

Работа на беларускай або рускай мове, прадстаўляемая на саісканне Дзяржаўнай прэміі, прымаецца да разгляду Камітэтам у наступнай камплектацыі:

3.1. Дакументы вылучэння на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў трох экзэмплярах, у іх ліку:

пісьмо-прадстаўленне ад органа кіравання (гл. п. 4.1.);
пісьмо-вылучэнне ад суб'екта вылучэння (гл. п. 4.2.);
выпіскі з пратаколаў (гл. п. 4.3.);
пратаколы падліковых камісій (гл. п. 4.4.);
анатацыя работы (гл. п. 4.5.);
даведкі аб творчым укладзе кожнага з аўтараў (гл. п. 4.6.);
звесткі пра кожнага з аўтараў (гл. п. 4.7.);
копіі пашпартоў (стар. 30 – 33) саіскальнікаў прэміі;
копіі тытульных лістоў статутаў суб'ектаў вылучэння.

Пералічаныя дакументы пераплятаюцца ў вызначанай паслядоўнасці клеявым спосабам з агульнай вокладкай у выглядзе асобнага тома з назвай:

«Дакументы вылучэння
_____»
(назва работы)

на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года.

3.2. Апісанне работы ў трох экзэмплярах (гл. п. 4.8.).

3.3. Надрукаваныя манаграфіі, падручнікі, альбомы, відэа- і аўдыёзапісы, копіі артыкулаў і іншыя матэрыялы і дакументы, якія ўваходзяць у склад работы і характарызуюць яе, у трох экзэмплярах.

3.4. Анатацыя работы ў шасці экзэмплярах (гл. п. 4.9.).

3.5. Кароткая анатацыя работы ў двух экзэмплярах і ў электроннай форме (гл. п. 4.10.).

4. Рэкамендацыі па афармленні дакументаў

4.1. Пісьмо-прадстаўленне работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі ад калегіі рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, калегіяльнага органа кіравання іншай дзяржаўнай арганізацыі, падпарадкаванай Ураду Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на адрас Камітэта афармляецца на афіцыйным бланку органа кіравання ў трох экзэмплярах па наступнай форме:

«Калегія (Прэзідыум) _____
(поўная назва органа кіравання)

прадстаўляе на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года ў галіне

_____»
(назва віду Дзяржаўнай прэміі)

1. _____»;
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

…. _____»;
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

n. _____»;
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

за работу «_____».
(назва работы ў адпаведнасці з яе зместам)

Пісьмо-прадстаўленне падпісваецца кіраўніком органа кіравання і павінна быць зарэгістравана.

4.2. Пісьмо аб вылучэнні работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (пісьмо-вылучэнне ад суб'екта вылучэння на саісканне Дзяржаўнай прэміі) у трох экзэмплярах павінна быць напісана на бланку арганізацыі, якая вылучае работу, на адрас органа кіравання, пазначанага ў п. 4.1., па наступнай форме:

«Вучоны (навуковы, навукова-тэхнічны, мастацкі, рэдакцыйна-выдавецкі, іншы) савет (сход калектыву працаўнікоў)

_____
(поўная назва арганізацыі)

вылучае на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года ў галіне

_____
(назва віду Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь)

1. _____»,
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

… _____»,
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

n. _____»;
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

за работу «_____».
(назва работы ў адпаведнасці з яе зместам)

Назва арганізацыі (месца працы саіскальніка) павінна адпавядаць юрыдычным актам аб яе заснаванні.

Пісьмо-вылучэнне павінна таксама ўтрымліваць:

кароткі змест работы,

абгрунтаванне вылучэння работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі,

агульную адзнаку работы,

звесткі аб датах пачатку і канца выканання работы, перыядзе практычнай рэалізацыі вынікаў,

дадзеныя аб маштабах рэалізацыі работы, яе навукова-тэхнічныя, тэхніка-эканамічныя паказчыкі, у тым ліку параўнанне з аналагамі; для работ у галіне літаратуры, мастацтва, архітэктуры таксама характарыстыку мастацкіх вартасцей работы, культурны, сацыяльны, іншыя эфекты.

Пісьмо-вылучэнне павінна быць падпісана кіраўніком арганізацыі – суб'ектам вылучэння, мець зыходны нумар і павінна быць заверана пячаткай.

ЗАЎВАГА 1. У выпадку, калі кіраўнік арганізацыі ўваходзіць у склад калектыву саіскальнікаў, пісьмо падпісваецца яго намеснікам. Калі саіскальнік знаходзіцца на пенсіі або прадстаўляецца на саісканне прэміі пасмяротна, гэта адзначаецца ў пісьме аб вылучэнні работы, пры гэтым указваюцца яго апошняя пасада і месца працы.

4.3. Выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў савета галаўной арганізацыі і саветаў сумежных арганізацый (або сходу калектыву работнікаў галаўной арганізацыі і сходу калектыву сумежнай арганізацыі) аб вылучэнні работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі з указаннем поўнай назвы работы, усяго складу аўтарскага калектыву, вынікаў галасавання як па вылучэнні работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі, так і па кожнаму з аўтараў.

Выпіска павінна ўтрымліваць звесткі пра тое, калі, кім і ў якой колькасці зацверджаны склад прэзідыума, калегіі, савета або сходу, прыняты ў дадзенай арганізацыі кворум, інфармацыя (спіскі) аб прысутнасці запрошаных удзельнікаў пасяджэння.

Калі ў склад аўтарскага калектыву саіскальнікаў уключаюцца асобы, якія не з'яўляюцца працаўнікамі галаўной па вылучэнні работы арганізацыі, такім жа чынам афармляюцца выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў саветаў па месцы асноўнай працы гэтых асоб адносна іх ўключэння ў склад аўтарскага калектыву.

Выпіска падпісваецца старшынёй пасяджэння савета (сходу), сакратаром і завяраецца пячаткай.

У выключных выпадках (адсутнасць савета, немагчымасць правядзення сходу калектыву работнікаў) можа быць прадстаўлена пісьмо на афіцыйным бланку арганізацыі аб рэкамендацыі на вылучэнне работнікаў гэтай арганізацыі ў склад аўтарскага калектыву, падпісанае яе кіраўніком і заверанае пячаткай.

ЗАЎВАГА 2. Ва ўсіх дакументах назва работы павінна быць аднолькавай.

4.4. Пратакол падліковай камісіі аб выніках тайнага галасавання адносна складу саіскальнікаў афармляецца ў трох экзэмплярах як частка пратакола пасяджэння савета арганізацыі па наступнай форме:

ПРАТАКОЛ № ____
падліковай камісіі пасяджэння савета _____
_____ ад _____ _____ 2019 г.
(поўная назва арганізацыі)

Падліковая камісія ў складзе: _____
_____
абрала старшынёй камісіі _____

СЛУХАЛІ: Аб вылучэнні аўтарскага калектыву па рабоце
_____
(назва работы)
на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года
_____
(назва віду Дзяржаўнай прэміі)

У спіс для тайнага галасавання ўнесены кандыдатуры:

1. _____»
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

….. _____»
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

n. _____»
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)

за работу _____»
(назва работы)

Раздадзена ____ бюлетэняў
Пры ўскрыцці ў скрыні аказалася ____ бюлетэняў

ВЫНІКІ ГАЛАСАВАННЯ*:*

1. _____ Вылучыць ___
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара) Адхіліць _____
…. _____ Вылучыць ___
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара) Адхіліць _____
n. _____ Вылучыць ___
(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара) Адхіліць _____

Старшыня падліковай камісіі: _____
Члены падліковай камісіі: _____
_____

4.5. Анатацыя работы памерам 10 старонак.

Анатацыя работы афармляецца ў адпаведнасці са стандартнымі патрабаваннямі да тэкставых дакументаў на лістах фармату А4.

У анатацыі павінна быць абгрунтавана аб'яднанне работы ў адзіны цыкл, кароткa выкладзены змест работы, яе асноўныя вынікі, звесткі аб практычнай рэалізацыі (дзе, калі, у якім аб'ёме ўкаранёны вынікі работы, якія дасягнуты эканамічны, сацыяльны, культурны або іншыя эфекты). Для работ у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры падкрэсліваюцца асноўныя эстэтычныя вартасці, дасягнуты мастацкі ўзровень.

У выпадку, калі работа вылучана на саісканне Дзяржаўнай прэміі паўторна, неабходна адзначыць змяненні, дапаўненні і развіццё, якія работа атрымала з часу папярэдняга вылучэння.

Да анатацыі дадаецца пералік (спіс) уключаных у работу публікацый, патэнтаў, даведак аб укараненні вынікаў.

Анатацыя падпісваецца ўсімі саіскальнікамі. Сапраўднасць подпісаў засведчваецца ва ўстаноўленым парадку.

4.6. Даведка аб творчым укладзе кожнага саіскальніка асобна (з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, пасады ў час выканання работы). Даведка падпісваецца кіраўніком арганізацыі, у якой працуе саіскальнік, або арганізацыі, якая яго вылучае.

Калі даведка аб творчым укладзе афармляецца не па месцы працы саіскальніка, да яе дадаецца даведка аб падтрымцы яго кандыдатуры арганізацыяй, дзе ён працуе, за подпісам кіраўніка.

Подпіс кіраўніка завяраецца гербавай пячаткай.

4.7. Звесткі аб кожным саіскальніку:

прозвішча, імя, імя па бацьку на рускай і беларускай мовах; дзень, месяц і год нараджэння; месца нараджэння (дакладна як у пашпарце);

грамадзянства;

спецыяльнасць па адукацыі;

вучоная ступень (з указаннем галіны ведаў) і вучонае званне;

ганаровыя званні;

месца працы (назва арганізацыі і яе месцазнаходжанне ў адпаведнасці з дакументамі аб заснаванні), службовы тэлефон;

займаемая пасада (з указаннем з якога года);

дзяржаўныя ўзнагароды і прэміі (з указаннем даты ўзнагароджання; калі саіскальнік з'яўляецца лаўрэатам прэміі, неабходна паведаміць, якой прэміі і за якую работу);

знаходжанне за мяжой (краіна, перыяд знаходжання);

валоданне замежнымі мовамі;

праца ў мінулым (перыяд, месца працы);

асноўныя напрамкі навуковай і практычнай дзейнасці, удзел у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі;

хатні адрас (з указаннем паштовага індэкса); тэлефон (з указаннем тэлефоннага кода); мабільны тэлефон;

копія старонак 30–33 пашпарта.

Звесткі аб кожным саіскальніку афармляюцца па месцы асноўнай працы саіскальніка і падпісваюцца саіскальнікам. Калі саіскальнік вылучаецца пасмяротна, то ў звестках пра яго неабходна даць адрас, прозвішча, імя, імя па бацьку нашчадка. Дакладнасць звестак засведчваецца подпісам работніка аддзела кадраў з указаннем даты афармлення і завяраецца пячаткай.

Дакументы вылучэння, пералічаныя ў пп. 4.1. – 4.7., пераплятаюцца ў адзіны том у адпаведнасці з рэкамендацыямі п. 3.1.

ЗАЎВАГА 3. Калі пасля вылучэння работы адбыліся змены ў звестках аб саіскальніку, ён павінен паведаміць пра гэта ў Камітэт у дзесяцідзённы тэрмін.

4.8. Апісанне работы.

Рэкамендуемы аб'ём апісання работы – каля 50 стар.

У апісанні работы выкладаецца асноўны змест работы, прыводзяцца атрыманыя вынікі, паказваюцца маштабы рэалізацыі, перспектывы далейшага выкарыстання, фактычна атрыманы і прагназуемы эфекты, ацэньваецца яе значнасць у параўнанні з іншымі дасягненнямі ў дадзенай галіне навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва або архітэктуры. Калі работа выканана ў межах дзяржаўных праграм, аб гэтым даецца адпаведная інфармацыя. Асноўныя паказчыкі рэалізацыі вынікаў работы патрэбна падмацаваць спасылкамі на афіцыйныя дакументы, рэцэнзіі, водгукі. Мэтазгодна прадставіць адзіную даведку, падпісаную кіраўніком арганізацыі, якая вылучае работу, аб тэхніка-эканамічных перавагах работы, аб мастацкай і эстэтычнай вартасці твораў літаратуры, мастацтва, архітэктуры.

У апісанне работы ўключаюцца неабходныя ілюстрацыі, схемы, табліцы, а таксама водгукі, рэцэнзіі, заключэнні, копіі патэнтаў, даведкі аб укараненні вынікаў работы (для аб'ектаў новай тэхнікі і тэхналогій); спіс асноўных публікацый аўтараў; пералік выставак, публічных паказаў і г. д.

Апісанне павінна пачынацца з тытульнага ліста, на якім указваюцца:

поўная назва арганізацыі-суб'екта вылучэння работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі;

назва работы;

прозвішча, імя, імя па бацьку кожнага саіскальніка з указаннем пасады, месца працы, вучонай ступені і звання.

Апісанне работы афармляецца ў адпаведнасці са стандартнымі патрабаваннямі да тэкставых дакументаў на паперы фармата А4 і падпісваецца саіскальнікамі.

Кожны экзэмпляр апісання павінен быць пераплецены клеявым спосабам з агульнай вокладкай. На вокладцы ўказваюцца суб'ект вылучэння работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, поўная назва работы, прозвішчы і ініцыялы саіскальнікаў.

4.9. Анатацыя работы ў 6 экзэмплярах.

Дадатковыя экзэмпляры анатацыі работы ў 6 экзэмплярах (патрабаванні да анатацыі гл.: пп. 3.1. і 4.5.) памерам 10 старонак афармляюцца ў выглядзе асобных брашур у мяккай вокладцы і не падпісваюцца аўтарамі.

4.10. Кароткая анатацыя работы агульным аб'ёмам каля 3000 знакаў у адным экзэмпляры, якая ўключае поўную назву работы, прозвішчы і ініцыялы саіскальнікаў, з указаннем пасады і месца працы, назву суб'екта вылучэння не падшываецца і прадстаўляецца разам з яе электроннай версіяй у выглядзе файла, сумяшчальнага з MS Word (міжрадковы інтэрвал адзінарны, шрыфт 15 pt, гарнітура Times New Roman, стыль «Звычайны»).

ЗАЎВАГА 4. Афармленне і прадстаўленне дакументаў і матэрыялаў па работах, якія ўтрымліваюць інфармацыю, якая не падлягае распаўсюджванню, ажыццяўляецца ва ўстаноўленым парадку.

ЗАЎВАГА 5. У першы экзэмпляр зборніка дакументаў вылучэння работы ўключаюцца толькі арыгінальныя (першыя) экзэмпляры дакументаў, у два другія экзэмпляры зборніка дакументаў вылучэння могуць уваходзіць іх ксеракопіі.

ЗАЎВАГА 6. Для своечасовага афармлення ўсіх неабходных дакументаў па вылучэнні работ рэкамендуецца ў перыяд люты – май 2019 года правесці вылучэнне работ у арганізацыях, творчых саюзах і г. д., пасля чаго накіраваць матэрыялы ў вышэйстаячыя кіруючыя органы для разгляду работ на працягу чэрвеня – верасня 2019 года і прадстаўлення іх у Камітэт да 1 кастрычніка 2019 года.

5. Прыём і вяртанне работ

Дакументы і матэрыялы работ прымаюцца сакратарыятам Камітэта асабіста ад саіскальнікаў або даверaных асоб ад суб'екта вылучэння па адрасе: праспект Незалежнасці, 66, пакой 317, 220072, г. Мінск.

Тэл./факс 8 (017) 284-24-56; тэл./факс 8 (017) 284-23-81.

Матэрыялы работ, якія не дапушчаны да конкурсу, павінны быць атрыманы іх аўтарамі ў сакратарыяце Камітэта на працягу месяца пасля апублікавання ў друку («Звязда», «Культура», «Літаратура і мастацтва», «Народная газета», «СБ: Беларусь сегодня») спіса дапушчаных да конкурсу работ.

Матэрыялы работ, дапушчаных да конкурсу, але не ўдастоеных прэмій, павінны быць атрыманы саіскальнікамі ў сакратарыяце Камітэта на працягу трох месяцаў пасля апублікавання ў друку Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года.

Спытайце пра радзіннае

Калі на самай справе надыходзіць Калядная ноч?

Пытанне пра святкаванне Калядаў нам задала Любоў Мікалаеўна з г. Жыткавічы Гомельскай вобласці.

Заканчэнне старога і пачатак новага года — амаль што няўлоўная, імгненная, нават нейкая віртуальная мяжа ў каардынатах сучаснага вымярэння часу. Бывае, так і хочацца націснуць на нейкую кропку, каб спыніць няўмольную хаду-ціканне насценнага гадзінніка, ухапіць гэта імгненне-мяжу, заціснуць у кулак і патрымаць яго хоць бы столькі, пакуль паспееш загадаць і прагаварыць сам сабе ўсе жаданні і самыя патаемныя мары. А потым выпусціць гэтую птушку ў прасторы Вечнасці і пажадаць новай сустрэчы з ёю роўна праз год.

Наша сучаснае жыццё становіцца настолькі дынамічным, мазаічным, а часам хаатычным, што мы не паспяваем (а можа, не хочам спыніцца) глыбока і змястоўна асэнсаваць сваё жыццё, пражыты год, прааналізаваць тое, што ўдалося і чаму, падумаць-паразважаць пра будучыню.

А як некалі сустракалі новы год нашы продкі? Чым яны жылі, на што спадзяваліся, у што верылі, чым цешылі сябе і сваю душу ў доўгія зімовыя вечары?

Практычна ўся Еўропа на пачатку X стагоддзя пачынала новы кругазварот са свята Раства Хрыстова. Гістарычныя звесткі, археалагічныя матэрыялы, шматлікія творы народнай паэзіі сведчаць аб тым, што беларусы, як і іх блізкія суседзі, распачыналі год у розны час, але ён вагаўся пераважна вакол дня веснавога раўнадзенства. Гэта магло быць на Аўдоццю-вясноўку (14 сакавіка), 21 сакавіка — у дзень веснавога раўнадзенства, 22 сакавіка — на Саракі. На больш позніх этапах пачатак года у розных рэгіёнах Беларусі не супадаў. Тая тэрыторыя, якая была ў складзе Рэчы Паспалітай, з 1364 года святкавала нараджэнне года 1 студзеня. Ва ўсходняй частцы Беларусі год пачынаўся з вясны, а затым з 1493 да 1700 года ў адпаведнасці з Візантыйскай царкоўнай традыцыяй — 1 верасня. Трэба адзначыць, што «кніжны», царкоўны варыянт летазлічэння не атрымаў падтрымкі ў асяроддзі простага народа. У 1700 годзе выйшаў загад Пятра Вялікага аб святкаванні пачатку года 1 студзеня. Менавіта ў гэты час адзначаюць Новы год усе еўрапейскія народы і ў наш час. Тры стагоддзі існавання гэтай традыцыі на Беларусі пакінулі адбітак у каляндарна-абрадавай паэзіі. Тыя ж валачобныя песні зафіксавалі традыцыю распачынаць новы гадавы цыкл з Калядаў або Раства Хрыстовага: «Святое Раство напярод прыйшло, святое Васілле на Новы год, а на Новы год паздраўляецца...»

У структуры ўсяго каляднага цыкла святкаванняў было тры куцці, якія чаргаваліся з інтэрвалам у адзін тыдзень. Спачатку адзначалі Першую, Бедную, Посную куццю, потым Багатую, Шчодрую, нарэшце Трэцяя куцця зноў-такі была Поснай і Вадзяной. Гэта чаргаванне настолькі прадуманае, дакладна вывераное, што нам застаецца толькі дзівіцца мудрасці нашых далёкіх продкаў. Каб зразумець гэты жыццёва-прыродны рытм, трэба звярнуцца да схемы, на якой зафіксаваны фрагмент народнага календара, які ахопліваў час напярэдадні Калядаў і які ішоў услед за імі. Схема паказвае, што Каляды з'яўляюцца своеасаблівым двухтыднёвым мастком-пераходам з Піліпаўскага посту ў Зімовы Мясаед. Хіба можна было пасля працяглага і строгага ўстрымання ад ежы жывёльнага паходжання адразу ж перайсці ў Мясаед? Зразумела — нельга. Таму Каляды з іх прадуманай зменлівасцю, паслядоўнасцю, пластычнасцю пераходу — Посная — Багатая — Посная куцця — паступова «выводзілі» чалавека з зоны працяглага ўстрымання (посту) і гэтаксама няспешліва рыхтавалі («паводзілі») да часу актыўнага спажывання тлустай ежы. Менавіта такі ж паслядоўны, узважаны, дакладна разлічаны пераход будзе вызначаць жыццё людзей у прамежку часу паміж Мясаедам — Масленіцай («мясапустам») і Вялікім постам.

Калі ўспомніць гістарычны дыялог культур, які адбываўся на Беларусі на працягу многіх стагоддзяў, то атрымалася так, што разам з Першай калядной куццёй сталі адзначаць Раство Хрыстова, разам з Другой куццёй — святое Васілле, разам з Трэццяй куццёй — Вадохрышча, або Богаяўленне.

Ну а зараз давайце засвоім: беларусы-каталікі святкуюць Каляды з 24 снежня да 6—7 студзеня, праваслаўныя беларусы — з 6 да 20—21 студзеня.

Першая, Посная, куцця і Раство Хрыстова святкуюцца беларусамі-каталікамі 24—25 снежня, праваслаўнымі беларусамі — 6—7 студзеня.

Другая, Шчодрая, Багатая куцця і ўшанаванне святога Васілія Кесарыйскага (у народзе — святое Васілле), а таксама Новы год святкуюцца беларусамі-каталікамі 31 снежня — 1 студзеня, праваслаўнымі беларусамі 13—14 студзеня. Адсюль і назва Стары Новы год.

Трэцяя, Посная, Вадзяная куцця і Вадохрышча святкуюцца беларусамі-каталікамі 5—6 студзеня, праваслаўнымі беларусамі — 18—19 студзеня.

Такім чынам, гістарычна дакладным з'яўляецца святкаванне першай Калядной ночы вечарам з 24 на 25 снежня, аднак не будзе недарэчнасцю і тое, калі доўгачаканыя госці-калядоўшчыкі завітаюць да вас у хату вечарам 7 студзеня. Галоўнае — каб вашу хату не абмінулі сонечнае навалецце, святло, дабро і шчасце.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Адным даспадобы
неапальскі брыз,
Другім — на Канарах
пад пальмамі цешыцца,
А я — вакол сонца
сабраўся ў круіз:
Лячу на дванаццаць
цудоўнейшых месяцаў.

Шыкоўней круізу
на свеце няма,
Лячу па арбіце —
і ў шчасце не верыцца.
Усіх выпраўляе ў дарогу
зіма.
Яна ж абяцае сустрэць,
калі вернемся...

Вярнуліся. Зноў на Зямлі
Новы год,
І зноў у дарогу зямляне
збіраюцца.
Ля хаты чакае мяне
касмалёт —
Лячу вакол Сонца!
Жыву, пакуль марыцца!

Запрашальнік

Мроі залатых канфеці

Сёння, 3 студзеня, у 17 гадзін у Мастацкай галерэі «Беларт» Беларускага саюза мастакоў, якая знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Карла Маркса, 4, адбудзецца адкрыццё выстаўкі Марыі Голубевай «Новае ... Залатое». Работы мастачкі дапамогуць наведвальнікам яшчэ раз апынуцца ў атмасферы цуда Раства, навагодніх таямніц і чараўніцтва.



«Тонкія вобразы, навеяныя гукамі завеі і цяплом імбірных пернікаў, пахам зялёнай ігліцы і бляскам навагодніх цацак, дапамагаюць гледачу зноў і зноў перажыць гэтыя цудоўныя гадзіны: імгненне чакання гуку званочка Санта-Клауса, вечар у прадчуванні падарунка і гады цёплага сямейнага шчасця, — дзеліцца ўражаннямі культуролаг Уладзімір Голубеў. — Набор метафар і вобразаў, з якіх складаюцца сюжэты карцін, далучаюць гледача да карагода бліскучых бенгальскіх агнёў, мрояў залатых канфеці і дыму хлапушак. Трапяткое мігценне золата на карцінах, тонаў сфумата і мяккія контуры фактур падкрэсліваюць глыбіню сюжэтаў і літаратурных матываў. У іх па волі аўтара заўсёды адлюстроўваюцца веліч любові, прыгажосці і дабра».

Прыбраныя ялінкі, навагоднія цацкі, гімназічныя гербарыі, экзістэнцыяльныя каты, кітайскія камоды, парцалянавыя сланы, амаль рэальны водар мандарынаў і шакаладу — усё гэта можна ўбачыць і адчуць на выстаўцы, нібы апынуўшыся на сапраўднай навагодняй вечарыне. Карціны выкананы ва ўнікальнай аўтарскай тэхніцы, на іх, нібы ў «краме Цудаў», перад позіркам здзіўленага гледача з'яўляюцца бабуліны шафы з адзеннем, сямейныя буфеты, напоўненыя антыкварыятам са стагоддзяў дэкадансу і пераломных часоў.

Фамільны посуд у паціне на карцінах аўтара — як водбліск даўняга свету арыстакратычных выгодаў і павольных гутарак ля каміна. Кожная работа на выстаўцы — гэта майстэрскі сінтэз літаратурнага сюжэта і візуальнай формы, узор тэхналагічных магчымасцяў шматслаёвай фактуры і празрыстага залатога колеру, які стварае дзіўна тонкі настрой светлага суму і неўміручай надзеі.

Работы мастачкі, сабраныя ў «інтэлектуальны тэкст», запамінаюцца стылістычнай вытанчанасцю, кампазіцыйнай элегантнасцю і філігранным майстэрствам. «Жывапіс, батык і арт-аб'екты Марыі Голубевай ствараюцца як канцэптуальныя творы для фарміравання не «яркай і нахабнай» прасторы паспяховага жыцця напаказ, а для цёплага і ўтульнага хатняга інтэр'еру, для знаходжання міру і спакою ў душы, для медытатыўнага сузірання і пазітыўнага «рэлаксу», — рэзюмуе Уладзімір Голубеў.

Выстаўка будзе працаваць да 19 студзеня: з панядзелка да аўторка з 11 да 20 і ў суботу з 11 да 19. Уваход вольны.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

З днём нараджэння, з прыгожай круглай датай шчыра віншуем шаноўную каляжанку **Валянціну Цімафееўну МАЗЖАРАВУ!** Зычым моцнага здароўя, бадзёрасці, аптымізму...

Каб зоркі падалі ў руку,
Каб вам ва ўсім спрыяла неба,
І каб хапала ў кашальку
На ўсе надзённыя патрэбы!

Звяздоўцы.

Дарагая наша мамачка Карповіч Галіна Іванаўна!

Трымай ад нас ты з нараджэннем віншаванні,
Каханне каб ў жыцці заўжды было!
Прымі таксама шчасця пажаданні,
Багацце ў хату каб тваю плыло!

Няхай здзяйсняюцца надзеі,
Расце павага, вопыт на вачах,
Ў жыцці здараюцца цудоўныя падзеі,
І будзе доўгім твой жаночы шлях!

З найлепшымі пажаданнямі муж Вячаслаў, дочкі Аксана і Наталля з сем'ямі.

Шаноўнага **Віктара Сямёнавіча МАРОЗАВА,** ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, ардэнаносца, ганаровага сябра шахматнага клуба «Гамбіт», шчыра віншуем з 95-годдзем! Зычым моцнага здароўя, дабрабыту, бадзёрасці і новых перамог. Мы ганарымся вамі!



Сябры-шахматысты.

СКАНВОРД

Глядзі фота № 1 | Частка п'есы | Пачатак, аснова чаго-небудзь
Ансамбль з трох | Плод капусты | Кветка для варажбы | Атрымальнік ліста
Тара для шопінгу | Глядзі фота № 2 | Хвала ў вершах
Ненавідны чалавек | Струнны шчыпковы інстр. | Цягнік пад зямлёй | Дзюба ў птушкі
Тое, што і аблога
Газ пад літарай N | Кіеўская княгіня | Асоба, якая вядзе банкет | Выконвае прыгавор
Расце ў абжоры | Кантора фірмы
Жалезны стрыжань
Першая грэчаская літара | Правадыр турыстаў
Адзненне святара

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Шакал. Трыа. Камар. Сумка. Нос. Азот. Асада. Кат. Жывот. Лом. Альфа. Гід. Раса. **Па вертыкалі:** Акт. Азы. Рамонак. Адрасат. Качан. Саз. Метро. Ода. Абжора. Вольга. Тамада. Офіс.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	17.00	7.32
Віцебск —	9.25	16.42	7.17
Магілёў —	9.18	16.50	7.32
Гомель —	9.06	16.55	7.49
Гродна —	9.42	17.17	7.35
Брэст —	9.34	17.26	7.52

Месяц

Апошняя квадра 29 снежня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Міхаіла, Мікіты, Пракопа, Пятра.*
К. *Дануты, Гервазія, Люцыяна, Пятра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Дзве дзяўчыны:

— Як ты думаеш, кім мне прыбрацца на Новы год, каб мяне ўсе жадалі?

— Селядцом пад шубай.

— Мне трэба тое, што я хачу, бо чаго хоча жанчына, таго хоча Бог!

Ну што ж, купіў ёй бігудзі.

Першага студзеня: пакуль снедаў — сцямнела!

Жонка выказала цікавае жаданне на Новы год.

Самы ціхі час у горадзе ў новым годзе — 1 студзеня да паўдня: ні пешаходаў, ні тараў...

caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

3 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1738 год — нарадзіўся (маёнтак Яшнец, цяпер у Лідскім раёне) Казімір Нарбут, асветнік, прадстаўнік эклектычнага кірунку ў філасофіі эпохі Асветніцтва ў Беларусі і Літве. З 1773 года — у Германіі і Францыі. Удзельнічаў у рабоце Адукацыйнай камісіі. Выступаў за вызваленне філасофіі ад схаластыкі і багаслоўя, за развіццё навукі. Адстойваў ідэю неабходнасці шырокай свецкай адукацыі, якая спрыяе фарміраванню развітой асобы. Аўтар курса «Эклектычнай філасофіі» і шэрагу рукапісаў на лацінскай мове. Памёр у 1807 годзе.

1821 год — нарадзіўся (Жлобінскі раён) Міхаіл Сяргеевіч Башылаў, беларускі мастак. У 1866—1870 гадах працаваў інспектарам Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства. Пісаў партрэты, палотны на беларускія і ўкраінскія тэмы, ілюстраваў класічныя творы пісьменнікаў. Сярод работ: ілюстрацыі да камедыі «Гора ад розуму» А. Грыбаедава, жанравыя карціны «Прыйшло пісьмо ад сына», «Селянін у бядзе» і інш. Памёр у 1870 годзе.

1908 год — нарадзіўся Яўген Аляксеевіч Зайцаў, беларускі жывапісец, народны мастак Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР. У 1943—1944 гадах удзельнічаў у афармленні беларускіх выданняў «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». Працаваў у станковым і манументальным жывапісе. Аўтар шэрагу карцін, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне і гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыцы. Памёр у 1992 годзе.

1922 год — у Мінску адкрыта Беларуская рэспубліканская кантора Дзяржбанка РСФСР (з 1991 года — Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь).

У свеце

1924 год — дзень нараджэння Ульяны Громавай, камсамолкі-падпольшчыцы, аднаго з кіраўнікоў падпольнай арганізацыі «Маладая гвардыя». Герой Савецкага Саюза (1943). Разам з іншымі падпольшчыкамі вяла масава-палітычную работу сярод насельніцтва, знаёміла працоўных з падзеямі на франтах і ў савецкім тыле, удзельнічала ў выпуску лістовак, вывешванні чырвоных сцягоў. У студзені 1943-га арганізацыя была раскрытая, яе члены арыштаваны. Загінула ў ноч на 16 студзеня 1943 года: пасля жорсткіх катаванняў У. Громаву разам з іншымі маладагвардзейцамі немцы скінулі ў шурф Краснадонскай шахты № 5. Імем Громавай названа вуліца ў Оршы.



1938 год — нарадзіўся Аляксандр Сяргеевіч Лазараў, савецкі і расійскі акцёр, артыст Маскоўскага тэатра імя У. Маякоўскага, народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Яшчэ раз пра каханне», «Па галоўнай вуліцы з аркестрам» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 2011 годзе.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 131.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12